Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЖНІЎНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №163 (28527)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Станок Гутэнберга — у Мінску**

СТАР. 3



**Падзяліцца досведам з Японіяй**

СТАР. 4



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Анатоль ЛІС, старшыня Брэсцкага аблвыканкама:**

*«Па выніках 2016 года фактычная доля выкарыстання мясцовых відаў паліва ў паліўным балансе прадпрыемстваў ЖКГ вобласці склала 34,5%. Сёння існуе шмат магчымасцяў і ў гарадах, і ў раённых цэнтрах мець рэзервовыя сістэмы выкарыстання мясцовых відаў паліва. Гэтым трэба скарыстацца, гэта можа значна патанніць кошт гігакалорыі. У вобласці дастаткова драўняных крыніц і торфу. Часам іх можна ўзяць, не прыкладаючы вялікіх намаганняў, гэта кошт, і над гэтым трэба працаваць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9335 | ▲ |
| Еўра | 2,2798 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0756 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X



# Калі веды даражэйшыя за золата

## Прэзідэнт патрабуе ўдасканалення сферы адукацыі. Але паступовага

**У XXI стагоддзі ўстойлівае развіццё любой дзяржавы вызначаецца не толькі рэсурсамі — радовішчамі нафты, газу або залатым запасам. Галоўнымі становяцца прарыўныя тэхналогіі, новыя галіны, што ствараюць эканоміку ведаў. На гэтым зрабіў акцэнт Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас свайго ўчарашняга выступлення на пленарным пасяджэнні Рэспубліканскага педагагічнага савета.**





Фота БЕЛТА.

### АДУКАЦЫЯ ЯК ДАМІНАНТА

Рэспубліканскі педсавет — мерапрыемства, якое апошні раз праводзілася ў краіне некалькі гадоў таму. Але сёння наша сістэма адукацыі стаіць на парозе новага этапу.

— Мы з вамі павінны параіцца, як будзем вырашаць тыя пытанні, што паўсталі перад адукацыяй. Нам трэба будзе зрабіць новы крок у дашліфоўцы, удасканаленні нашай адукацыі — дашкольнай, школьнай, вышэйшай, прафесійна-тэхнічнай.

Роля адукацыі паступова становіцца дамінуючай у свеце.

— Менавіта эканоміка ведаў, а таксама прафесіяналы, якія шчыра любяць сваю краіну, забяспечваюць яе канкурэнтаздольнасць, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Адсюль узнікае заканамернае пытанне: ці гатова Беларусь адпавядаць гэтым тэндэнцыям? Настаўнік ва ўсе часы быў важнай крыніцай ведаў. Але сёння сфера адукацыі і, адпаведна, роля педагога кардынальна змяніліся.

У сучасным інфармацыйным асяроддзі, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, расце так званае пакаленне сеціва. Для моладзі інтэрнэт — гэта асяроддзе пражывання. Яна не бачыць сябе без электронных прылад.

— Цалкам згодны: гэтыя прылады патрэбныя, цікавыя і карысныя, — адзначыў Прэзідэнт. — Але яшчэ больш важна навучыць людзей думаць! Нам з вамі важна не забыць, што, як і раней, чалавека трэба вучыць думаць.

Беларускі лідар звярнуў увагу, што сёння школьнікаў, студэнтаў часта вучаць карыстацца толькі гатовым наборам ведаў. Як вынік, моладзь перастае аналізаваць і разважаць. Многія не здольны без інтэрнэту лагічна сфармуляваць думку і выказаць уласнае меркаванне. Далей ужо выглядае зразумелай праблема недахопу прафесіяналаў, а таксама незадаволенасць работадаўцы супрацоўнікамі.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены: такі падыход у адукацыі сёння непрымальны. У нас наперадзе вялікая праца па развіцці чалавечага патэнцыялу. Адпаведна, неабходна аб'ектыўна, без эмоцый даць ацэнку вынікам развіцця ўсіх звёнаў нацыянальнай адукацыі, намеціць перспектывы яе ўдасканалення.

— Ужо шмат што зроблена ў гэтым кірунку. Галоўнае — мы захавалі станоўчыя дасягненні, што дасталіся нам у спадчыну ад папярэдніх пакаленняў. Сярод іх — дзяржаўная падтрымка, сацыяльная справядлівасць, роўны доступ да адукацыі і яе годны ўзровень. Менавіта такімі прынцыпамі мы павінны кіравацца, плануючы любыя далейшыя пераўтварэнні ў гэтай сферы.

### НАШЫ ДЗІЦЯЧЫЯ САДКІ — НАЙЛЕПШЫЯ

Гаворачы пра сістэму дашкольнай адукацыі, кіраўнік краіны звярнуў увагу: Беларусь — лідар у гэтым плане ў рэгіёне.

Яшчэ не так даўно дастаткова вострым было пытанне недахопу месцаў у дзіцячых садках і яслях. Асабліва гэта датычылася новых мікрараёнаў, дзе сацыяльная інфраструктура не паспявала за будаўніцтвам жылля. Сёння гэта праблема вырашаецца. У краіне актыўна будуюцца новыя дашкольныя ўстановы. Толькі ў мінулым годзе ўведзена ў эксплуатацыю 12 дзіцячых садкоў, а сёлета — яшчэ 16.

Цяпер жа трэба ўкамплектаваць гэтыя ўстановы кваліфікаванымі спецыялістамі і зрабіць так, каб моладзь пасля размеркавання заставалася.

СТАР. 2

■ Прысядзібная ўборка

# ПРЫЙШОЎ НА ПАЛЕТКІ КАМБАЙН...

## У Гродзенскім раёне вяскоўцы сочаць за калгаснай уборкай і чакаюць тэхніку на сваіх сядзібах

**Землі СВК «Ніва-2003» падыходзяць да самай мяжы з Польшчай. У гэтым кутку Гродзенскага раёна гаспадары заўсёды мелі свае соткі, якія ніколі не пуставалі. Такая сітуацыя захавалася і па сённяшні дзень.**

Бал ворыва ў гэтых мясцінах невысокі — крыху больш за 30 (на добры лад гэты паказчык павінен складаць 45—50). Але ў вытворчым кааператыве атрымліваюць не самы горшы ўраджай. Сёлета, напрыклад, ён складае 52 ц/га. А гэта амаль на 10 ц/га больш за сярэдні паказчык па вобласці.

Разам з галоўным аграномам Іванам Мацюком едзем на поле, дзе жнуць апошнія гектары. Маглі б завяршыць і на выхадных, але прайшла навальніца, і поле аказалася ў вадзе.

— Патокі вады былі такія моцныя, што маглі і машыну з дарогі знесці, — кажа Іван Яўгенавіч. — Я за сваю 40-гадовую працу такога не бачыў.

Камбайнер Алег Юнакоў стараецца набраць былы тэмп. Наперадзе яшчэ ўборка на прысядзібных палетках. Аб'ём работы таксама не малы, бо такіх гаспадароў, якія сеюць зерне, тут нямала. Таму на некалькі дзён хопіць работы. Сам Алег, як і многія работнікі СВК, такіх участкаў не мае, ды і часу няма іх даглядаць, бо і працоўны і выхадны дзень — у полі. Затое можна добра зарабіць. Толькі за адзін дзень больш за 100 рублёў выходзіць. Грошы ўжо размеркаваны — дачка вучыцца на платным аддзяленні, малодшую ў школу трэба сабраць.

СТАР. 4

# Калі веды даражэйшыя за золата

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Увогуле, пра дашкольную адукацыю скажу наступнае: калі ўзяць у комплексе, то наша дашкольная адукацыя не мае аналагаў у свеце. Па-першае, гэта амаль бясплатная дашкольная адукацыя. Па-другое, усе маюць роўны доступ да дашкольнай адукацыі, да ўсіх мы ставімся — прынамсі, у дзяржаве мы праводзім такую палітыку — аднолькава. Нідзе ў свеце такога няма.

## ЖЫЦЦЁ ВУЧНЯ — ГЭТА ЖЫЦЦЁ НАСТАЎНІКА

Менавіта сярэдняя школа фарміруе чалавека і яго светапогляд, сёння гэтаму ўзроўню адукацыі ўдзяляецца самая пільная ўвага.

— Моцная сістэма адукацыі трымаецца перш за ўсё на настаўніку, — упэўнены Прэзідэнт. — Галоўнае — гэта настаўнік. Не інтэрнэт, не камп'ютар. Усё гэта важна, але, я яшчэ раз падкрэсліваю, другарадна.

Раней было шмат скаргаў з-за высокай загружанасці настаўнікаў неўласцівымі ім функцыямі. Аднак у мінулым годзе міністэрства — пасля таго як Прэзідэнт прыняў адпаведнае рашэнне — запэўніла: прыняты вычарпальны спіс школьнай дакументацыі, пытанне залішняй нагрузкі знята.

— Аднак мне дакладваюць, што нашы настаўнікі па-ранейшаму скардзяцца на гэту праблему. Хачу падкрэсліць, што галоўная задача настаўніка — вучыць і выхоўваць дзяцей, а не займацца папяратворчасцю.

У той жа час кіраўнік краіны выказаў упэўненасць: настаўнік павінен жыць тым жыццём, якім жыве яго вучань. Так, калі ў вёсцы настаўніка просяць пракантраляваць, як вядзецца ўборка збожжа, сапраўдны педагог не адмовіцца:

— Талковы настаўнік, сапраўдны настаўнік ніколі не паскардзіцца, калі яго просяць нешта пракантраляваць, у тым ліку і ўборку. Гэта ўзбагачае настаўніка, тым больш што вы працуеце ў вёсцы, а там вучні больш-менш працуюць і на камбайнах са сваімі бацькамі. Але, калі шчыра, безумоўна, гэта не функцыя настаўніка.

Прэзідэнт успомніў тыя часы, калі сам быў вучнем. Тады настаўнік у вёсцы наведваў сваіх вучняў дома — кожны тыдзень. Калі ж Аляксандр Лукашэнка сам стаў настаўнікам, дырэктар і завуч яго школы строга спыталі: калі ты быў у сваіх вучняў?

— Гэтага нам страціць нельга. Настаўнік павінен жыць тым жыццём, якім жыве яго вучань. Ці ўсюды гэта сёння ёсць? Пытанне рытарычнае. Падумайце над гэтым, над адзінствам працэсу адукацыі і выхавання.

## ЗАРПЛАТА — БЕЗ ПРАБЛЕМ

А як з зарплатай? Як падкрэсліў Прэзідэнт, у наступным годзе гэта праблема павінна быць знята.

— Мы абавязкова павінны зрабіць той крок, пра які я казаў у плане заработнай платы, — упэўнены беларускі лідар. — Асабліва тым, хто працуе ў дзіцячых садках і яслях. Любымі спосабамі і любымі шляхамі нам трэба амаль што падвойваць у наступным годзе іх даходы.

Яшчэ адзін нюанс у плане аплаты працы, на які звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, — гэта яе дыферэнцыяцыя. Настаўнікі і па кваліфікацыі, і па загружанасці адрозніваюцца, але чаму тады зарплату ўсе яны атрымліваюць прыкладна аднолькавую? На думку кіраўніка краіны, гэта не зусім справядліва, як і тое, што маладыя настаўнікі, якія толькі-толькі прыйшлі на працу, атрымліваюць вельмі мала:

— Калі малады чалавек, прыйшоўшы з ВНУ, выкладае не горш, чым настаўнік-выкладчык з 25-гадовым стажам, чаму мы яму плацім капейкі? Трэба вызначыць крытэрыі, па якіх мы павінны плаціць зарплату настаўніку-наватару, выкладчыку адукаванаму, разумнаму, сучаснаму, які авалодаў усім неабходным для выкладання.

## ВАЖНЕЙ ЗА ДЫСЕРТАЦЫЮ

Пра тэрміновую неабходнасць новых падручнікаў для школ кіраўнік краіны апошнім часам гаворыць нярэдка. Патрабаванне Прэзідэнта, якое ён агучыў і падчас рэспубліканскага педсавета: новыя падручнікі па ўсіх прадметах неабходна падрыхтаваць да першага верасня 2019 года.

— Аснова школьнай адукацыі — добры падручнік. Гэта тое, што ў многім вызначае якасць ведаў вучняў. Нагадваю галоўнае патрабаванне — змест навучальнага матэрыялу павінен быць аптымальным па аб'ёме, па інфармацыі і яе глыбіні.

Акрамя гэтага, краіна мае патрэбу ва ўнікальных аўтарскіх методыках навучання і выхавання.

— Чаму мы не чуем пра сучасных настаўнікаў-наватараў? Дзе айчынныя Макаранкі, Сухамлінскія, Шаталавы? — задаўся пытаннем Аляксандр Лукашэнка. — Гэта папрок і вам (настаўнікам. — **Заўв. аўт.**), і ўладам таксама — тым, хто займаецца адукацыяй.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, аўтарскія методыкі навучання і выхавання — гэта «самае лепшае, што можа быць». Гэта важней за дысертацыі, доктарскія і кандыдацкія, таму што гэта ідзе адразу ад жыцця.

Сістэма паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, лічыць кіраўнік краіны, таксама патрабуе далейшага ўдасканалення.

— Яна павінна даць абітурыенту магчымасць прадэманстраваць не толькі пэўны набор ведаў па прадмеце, але і здольнасць лагічна разважаць, рабіць вывады і творча мысліць, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Папярэджваю, што карэкціроўка правілаў прыёму і інфармаванне грамадскасці аб зменах павінны адбывацца загадзя.

Неабходна мяняць падыходы да падрыхтоўкі будучых выкладчыкаў непасрэдна ў ВНУ. Асновай, на думку кіраўніка краіны, павінны стаць практычная педагогіка і псіхалогія.

Яшчэ адзін элемент выхаваўчай работы — ідэалагічны — таксама патрабуе дапрацоўкі. Прынамсі, гэта датычыцца маладзёжных арганізацый:

— Склалася ўражанне, што апошнім часам нашы ідэалагічныя памочнікі — маладзёжныя арганізацыі, грамадскія — захапіліся флэшмобамі, піяр-акцыямі і іншымі паказушнымі мерапрыемствамі. Гэта таксама, відаць, патрэбна, гэта сучасна... яны, відаць, забылі, што іх галоўная задача — гэта штодзённая карпатлівая праца з моладдзю. Аўтарытэт у гэтым асяроддзі неабходна заваёўваць канкрэтным рэзультатам рэальных спраў у кожнай установе адукацыі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

## «Пяць» ці «дзесяць» — не крытычна

### Прэзідэнт адказаў на пытанні ўдзельнікаў Рэспубліканскага педсавета

**Учарашняе мерапрыемства з удзелам кіраўніка дзяржавы праходзіла ў адкрытым фармаце. У зале стаялі мікрафоны, да якіх мог падысці любы ўдзельнік педсавета і задаць пытанне кіраўніку дзяржавы або проста выказаць сваё меркаванне, выступіць з прапановай. Пытанні былі розныя: і пра ролю рэгіянальных ВНУ, і пра сельскія школы, і пра інфармацыйную абарону дзяцей, і пра прэстыж нашых універсітэтаў у вачах замежных студэнтаў, і пра магчымае вяртанне да пяцібальнай сістэмы ацэнкі ведаў...**

Апошняе, відаць, самае абмеркаванае. На думку Прэзідэнта, рашэнне трэба прымаць тады, калі яно наспела.

— Так, я чую ў сродках масавай інфармацыі, бачу, чытаю, адсочваю працэс. Але гэтае пытанне не мае крытычнай масы, яно не наспела для таго, каб тут прымаць нейкія рашэнні, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён звярнуў увагу, што да сістэмы ацэнкі ведаў розныя пакаленні ставяцца па-рознаму. Старэйшым больш зручнай уяўляецца пяцібальная сістэма, і яны сёння вымушаны перакладаць сучасныя сямёркі і дзявяткі на стары лад. У моладзі ж такой праблемы няма.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што цікавіўся і меркаваннем свайго малодшага сына Мікалая па гэтым пытанні. Ён адказаў, што сённяшняя сістэма нармальная і да яе ўжо ўсе прывыклі.

— Таму з усіх пунктаў гледжання, з усіх каардынат, якія мне як Прэзідэнту ўдаецца атрымаць, я раблю выснову, што нам спяшацца не трэба, трэба паглядзець, недзе гэтую сістэму страсянуць, калі мы бачым нейкія недахопы, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Хоць я асабіста прыхільнік пяцібальнай сістэмы: прасцей, добра і зручна, усё зразумела. Але ўсё-такі цяпер ужо, пасля гадоў работы гэтай дзесяцібальнай сістэмы, я адчуваю, што яна прыжылася.

Тэма рэфармавання завочнай адукацыі таксама на слыху. Прэзідэнт запэўніў, што гэта будзе рабіцца вельмі акуратна. На яго думку, трэба, каб завочную адукацыю атрымлівалі тыя, каму гэта патрэбна, і, галоўнае, тыя, хто патрэбен дзяржаве і эканоміцы. Прэзідэнт запэўніў: тых людзей, якія сапраўды маюць патрэбу ў атрыманні завочнай адукацыі, дзяржава будзе падтрымліваць. Акрамя таго, прадпрыемствы таксама змогуць аплачваць вучобу сваім спецыялістам.

— Так ёсць і цяпер: недзе сам плаціць, недзе — бюджэт, недзе — прадпрыемства. Мы захаваем усё самае лепшае, але мы ў пачатку шляху.

■ У цэнтры ўвагі

## Ігар КАРПЕНКА: «Статус педагога ў грамадстве вызначае яго асоба»

**Праект канцэптуальных падыходаў да развіцця сістэмы адукацыі на кароткатэрміновую перспектыву (да 2020) і на перспектыву да 2030 года быў прадстаўлены ўдзельнікам Рэспубліканскага педагагічнага савета.**

Як зазначыў у сваім выступленні **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА,** педагогі заўсёды абмяркоўвалі самыя складаныя пытанні на педагагічных саветах.

— Сёння перад намі стаіць задача далейшага ўдасканалення нацыянальнай мадэлі шматузроўневай адукацыі, якая адпавядала б сучасным і, галоўнае, перспектыўным патрэбам чалавека, грамадства і дзяржавы. Пры абнаўленні такой мадэлі трэба зыходзіць, па-першае, з дзяржаўных інтарэсаў і патрэб інавацыйнай эканомікі. Па-другое, абапірацца на самыя лепшыя нацыянальныя адукацыйныя традыцыі з улікам асноўных сусветных тэндэнцый. Па-трэцяе, забяспечыць даступнасць для кожнага якаснай адукацыі. Праект канцэптуальных падыходаў да развіцця сістэмы адукацыі быў распрацаваны з улікам даручэнняў кіраўніка дзяржавы, прапаноў, што паступілі ў ходзе абмеркавання новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі, і аналізу функцыянавання сістэмы адукацыі, — падкрэсліў міністр.

Пытанні абнаўлення зместу адукацыі па-ранейшаму стаяць на першым месцы. А гэта пастаянная работа з улікам дынамікі навукова-тэхнічнага прагрэсу над адукацыйнымі стандартамі, вучэбнымі планамі і праграмамі, вучэбнымі і вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі. «Мы павінны ўдзяліць асаблівую ўвагу ўзроўню метадычнай культуры педагога, перш за ўсё праз абнаўленне сістэмы падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў, — дадаў Ігар Карпенка. — Але якасць адукацыі не павінна вымярацца выключна вынікамі ЦТ, прадметных алімпіяд ці запаветным месцам у гімназіі. Яе трэба ацэньваць па ўзроўні асабовага і сацыяльнага развіцця кожнага вучня. Пры гэтым важна падрыхтаваць не асобных элітных навучэнцаў, а дапамагчы ўсім ажыццявіць сваё жыццёвае і прафесійнае самавызначэнне, забяспечыць сацыяльную і прафесійную мабільнасць асобы, яе канкурэнтаздольнасць у сучасным свеце».

Шмат пытанняў узнікае з функцыянаваннем гімназій. Міністр адукацыі выказаў занепакоенасць пэўнай элітарнасцю гімназічнай адукацыі. Усяго па краіне дзейнічае 210 гімназічных установаў, але на слыху знаходзяцца толькі некалькі дзясяткаў з іх. «Патрабаванні да якасці адукацыі ў гімназіях трэба рабіць больш жорсткімі, а прафілізацыю трэба звязваць не з уступнымі экзаменамі ў пяты клас, а са свядомым выбарам школьнікамі прафесіі, а гэта магчыма толькі ў старэйшым узросце. На практыцы вучоба ў гімназіі — гэта не выбар вучня, а, хутчэй, амбіцыі яго бацькоў, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі міністр. — Калі, здаўшы ўсе экзамены на «дзявяткі», вучань не паступае ў гімназію, такі стрэс нельга нічым апраўдаць. Лічу, што агульнаадукацыйная школа мае такое ж права, як гімназія і ліцэй, на далейшае навучанне адораных і матываваных навучэнцаў. Сумесна з педагогамі-практыкамі трэба выпрацаваць крытэрыі такога адбору. Гэта, упэўнены, будзе адпавядаць і прынцыпам сацыяльнай справядлівасці, і роўнай даступнасці агульнай сярэдняй адукацыі».

Ігар Карпенка выказаў упэўненасць у тым, што поспех у рэалізацыі акрэсленых у канцэпцыі задач залежыць ад кожнага работніка сістэмы.

— Я цвёрда перакананы: педагог — ключавая фігура ў адукацыі. Асоба педагога вызначае яго статус у грамадстве. Але ці можна гаварыць пра павагу да сваёй прафесіі так званых рэпетытараў ад адукацыі? Настаўнік, які не імкнецца эфектыўна выкарыстоўваць кожную хвіліну ўрока, каб вучыць і выхоўваць дзіця, хутчэй за ўсё, зацікаўлены ў тым, каб прапанаваць яму не падтрымліваючыя ці стымулюючыя заняткі, а паслугі рэпетытара. Выбарачны аналіз сітуацыі паказаў, што педагогі, якія былі задзейнічаны ў прыёмнай кампаніі ў ВНУ і на ўступных іспытах у гімназіях, адначасова з'яўляліся і рэпетытарамі, а гэта завуаліраваная форма карупцыі. Таму для выключэння магчымых канфліктаў інтарэсаў і карупцыйных рызык Міністэрства адукацыі прапануе ўнесці ў кантракты норму аб тым, што педагог абавязаны інфармаваць наймальніка аб ажыццяўленні ім дзейнасці рэпетытара.

На думку міністра, кожны ўрок, лекцыя, дадатковыя заняткі маюць вялізны выхаваўчы і ідэалагічны патэнцыял, але эфектыўнасць яго рэалізацыі ў вырашальнай ступені залежыць ад педагога.

Сістэме агульнай сярэдняй адукацыі трэба здзейсніць рывок у стварэнні інфармацыйнай адукацыйнай прасторы (Расійская Федэрацыя, між іншым, плануе гэта зрабіць усяго за 1,5—2 гады).

Міністр адукацыі праінфармаваў, што 1 верасня да заняткаў прыступяць каля 1 мільёна навучэнцаў, у тым ліку 110 тысяч першакласнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У Анголе сабраўся на пенсію лідар, які ведаў Брэжнева

У Анголе праходзяць парламенцкія выбары, па выніках якіх упершыню за 38 гадоў у краіне зменіцца кіраўнік дзяржавы.

74-гадовы ветэран палітычнай сцэны Анголы, дзеючы прэзідэнт Жазэ Эдуарду душ Сантуш, які кіруе краінай з 1979 года, загадзя абвясціў, што не збіраецца на гэтых выбарах вылучаць сваю кандыдатуру на першае месца ў партыйным спісе, але захавае ў далейшым за сабой пасаду старшыні «Народнага руху за вызваленне Анголы» (МПЛА).

Гэта азначае, што свой уплыў у краіне душ Сантуш захавае. І ў гэтым яму дапамогуць яго дзеці. Ягоная дачка Ізабель душ Сантуш — першая ў Афрыцы, па версіі Forbes, жанчына-мільярдэр, яна ўзначальвае дзяржаўную нафтаздабываючую кампанію Анголы. А сын Жазэ Філамена душ Сантуш адказвае за дзяржаўныя інвестыцыі.

Ангола — былая партугальская калонія. Яе незалежнасць была абвешчана 11 лістапада 1975 года. Пасля гэтых падзей душ Сантуш стаў міністрам замежных спраў краіны. Пасля смерці першага прэзідэнта Анголы Агасціна Нета 21 верасня 1979 года ён стаў старшынёй МПЛА, прэзідэнтам Анголы і галоўнакамандуючым узброенымі сіламі. У 1990 годзе душ Сантуш абвясціў аб пачатку ў краіне рэформаў, аб адмове ад марксізму-ленінізму як ідэалогіі партыі, пераходзе да шматпартыйнай сістэмы і рынкавай эканомікі.

### Рэйтынг прэзідэнта Францыі знізіўся ўдвая



За сто дзён работы ў Елісейскім палацы Эмануэль Макрон здолеў правесці толькі закон аб рэформе працоўнага заканадаўства, іншыя яго ініцыятывы застапарыліся. Эканоміка Францыі дэманструе рост, аднак узровень падтрымкі Макрона падае.

Міністр эканомікі ва ўрадзе Мануэля Вальса і заснавальнік цэнтрысцкага руху «Наперад, Рэспубліка!» увесну перамог на прэзідэнцкіх выбарах і стаў самым маладым кіраўніком французскай дзяржавы з часоў Напалеона І, абышоўшы ў выніковай сутычцы лідара нацыяналістаў, кандыдата ад «Нацыянальнага фронту» Марын Ле Пен.

У канцы вясны, па даных даследчага цэнтра IFOP, Макрона падтрымлівалі 62% французаў, у канцы чэрвеня падтрымка вырасла да 64%, пасля чаго пачала падаць. У сярэдзіне жніўня аб сваёй падтрымцы палітыкі прэзідэнта казалі толькі 36% французаў. Сацыялагічная служба IFOP днямі апублікавала даныя апытання, паводле якога 64% грамадзян не згодныя з дзеяннямі Макрона на пасадзе прэзідэнта. Гэта нават крыху ніжэй за падтрымку амерыканцамі Дональда Трампа. Французскія СМІ і эксперты тлумачаць зніжэнне рэйтынга чарадой скандалаў вакол розных прэзідэнцкіх ініцыятыў.

■ Рынак працы

# Ахоўнікі і кладаўшчыкі не патрэбны

**А на вакансіі фармацэўта і мастацкага кіраўніка адсутнічае канкурэнцыя**

**Міністэрства працы і сацыяльнай абароны назвала самыя запатрабаваныя прафесіі. Рэспубліканскі маніторынг попыту і прапановы на рынку праводзіцца двойчы на год — па стане на 1 чэрвеня і на 1 снежня.**

Так, у гарадах больш за ўсё вакансій сярод спецыялістаў было адкрыта для медыцынскіх сясцёр і ўрачоў — 3136 і 2405 адпаведна. Істотна не хапала фельчараў-лабарантаў (429), фельчараў (314) і інжынераў (311). Неабходны былі таксама выхавальнікі дашкольных устаноў, педагогі, галоўныя бухгалтары, ветэрынары, інспектары. Адметна, што на некаторых запатрабаваных вакансіі — рэнтгеналабарант, фармацэўт, мастацкі кіраўнік, інструктар па лячэбнай фізкультуры — увогуле не прэтэндаваў ніводны беспрацоўны з адпаведнай прафесіяй.

Калі казаць пра рабочых, то ў гарадской мясцовасці актыўна шукалі прадаўцоў і швачак — на пачатак чэрвеня было свабодна амаль па паўтары тысячы месцаў. Больш за тысячу прапаноў налічвалася для кіроўцаў аўтамабіляў. Неабходны былі таксама бетоншчыкі (606 вакансій) і муляры (508). Высокі попыт на санітарак, зборшчыкаў абутку, ратавальнікаў-пажарных, кантралёраў-касіраў, маляроў, цырульнікаў.

У сельскай мясцовасці сярод спецыялістаў самыя запатрабаваныя — ветэрынары. Для іх было адкрыта амаль 700 вакансій. Адчуваўся недахоп у медсёстрах, заатэхніках, інжынерах, бухгалтарах.

З рабочых прафесій у вёсках шукалі трактарыстаў-машыністаў (632 свабодныя працоўныя месцы), аператараў машыннага даення (598), жывёлаводаў (500). Шмат прапаноў работы для кіроўцаў аўтамабіляў і электрагазазваршчыкаў.

Што да незапатрабаваных прафесій, то ў гарадах гэта: дарожныя рабочыя, спецыялісты па кадрах, эканамісты, юрысты, ахоўнікі, адміністратары, паштальёны, кладаўшчыкі. У сельскай мясцовасці мала вакансій для цесляроў, прадаўцоў, слесараў, швачак, укладчыкаў-упакоўшчыкаў.

У міністэрстве адзначаюць, што ў апошні час на рынку працы абазначылася некалькі новых тэндэнцый. Вырас попыт на будаўнічыя спецыяльнасці, павялічылася доля вакансій некваліфікаванай працы (калі ў снежні мінулага года яна складала тры працэнты, то ў сёлетнім чэрвені — 4,1 працэнта). Знізілася таксама колькасць беспрацоўных, якія не маюць прафесіі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Даследаванні

# Жанчыны да банкаў бліжэй?

**БЕЛКАРТ выявіў асаблівасці паводзін спажыўцоў пры выбары банкаўскіх плацежных картак**

**Нацыянальная плацежная сістэма правяла маштабнае маркетынгавае даследаванне, яно праводзілася на ўсёй тэрыторыі краіны ў фармаце апытання ўладальнікаў картак. «Усе ўдзельнікі даследавання (каля тысячы рэспандэнтаў) з'яўляюцца трымальнікамі як мінімум адной банкаўскай карткі», — адзначыла начальнік аддзела маркетынгу БЕЛКАРТ Вольга ДАНІШЭЎСКАЯ.**

У выніку апытання было выяўлена, што большасць наведвальнікаў банкаў (72,3%) з'яўляюцца эканамічна актыўным насельніцтвам працаздольнага ўзросту 25—55 гадоў. Спецыялістамі было выяўлена, што з іх у групе 25—34 гадоў — 31,78%, а ў групе 35—55 гадоў — 40,55%. Самае галоўнае, што выявілі эксперты, — у банкі часцей любяць хадзіць жанчыны, чым мужчыны (60,2% на 39,8%).

Што ж датычыцца ўзроўню даходу на аднаго члена сям'і, то ў большасці рэспандэнтаў (57,6%) ён знаходзіцца ў межах 190—570 беларускіх рублёў. Пры выбары плацежнай карткі часцей за ўсё рэспандэнты (43% апытаных) звяртаюцца да рэкамендацый кансультанта банка. Другі па папулярнасці канал атрымання інфармацыі аб картках — інтэрнэт (24,7%).

Характэрна, што пытанне кошту банкаўскай карткі не з'яўляецца прынцыповым для большасці рэспандэнтаў. Гэты крытэрый як «важны» адзначылі толькі 9,2% апытаных. Таксама меншую цікавасць у пытаннях выбару карткі ўяўляе такі параметр, як атрыманне скідак пры аплаце карткай у арганізацыях гандлю і сэрвісу (6,4%). Цікава, што 58,8% рэспандэнтаў не выкарыстоўваюць дадатковыя банкаўскія прадукты на аснове картак, а з'яўляюцца трымальнікамі толькі зарплатнай карткі.

Унутраная плацежная сістэма БЕЛКАРТ з'яўляецца складанай і неад'емнай часткай цэласнай нацыянальнай плацежнай сістэмы нашай краіны. Галоўнай задачай яе з'яўляецца забеспячэнне фінансавай незалежнасці дзяржавы ад знешніх уздзеянняў і санкцый, а таксама павышэнне долі безнаяўнага грашовага абарачэння ўнутры краіны. Вядома, што па стане на 1 ліпеня ў карыстанні знаходзілася 5 млн 565 тыс. картак БЕЛКАРТ. Доля безнаяўных аперацый па картках нацыянальнай сістэмы складае 79,34%.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню. Напачатку было Слова

# ЦЭЛЫ СВЕТ — У РУКАХ

**У Нацыянальным гістарычным музеі прэзентавалі копію друкарскага станка Іагана Гутэнберга і высокатэхналагічны макет скарынаўскай Біблії**

Гэтыя прадметы зоймуць сваё месца ў экспазіцыі музея і будуць знаёміць наведвальнікаў з гісторыяй і традыцыямі кнігадрукавання.

Вынаходства друкарскага станка Іаганам Гутэнбергам у сярэдзіне XV стагоддзя сталася сапраўднай рэвалюцыяй у распаўсюджванні інфармацыі і ведаў. Калі раней кнігі каштавалі вялікіх грошай і былі даступныя толькі заможным людзям, то новая тэхналогія зрабіла іх вытворчасць нашмат больш хуткай і таннай, а значыць, навука і асвета наблізіліся да простых людзей.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Мастак Юрый СУХАЎ знаёміць з адметнасцямі тэхналогіі станка.

**Мастак Юрый СУХАЎ,** які спецыяльна для музея стварыў копію гутэнбергаўскага станка, расказаў, што цікава было працаваць не толькі над узнаўленнем самога механізма, але іназіраць за тым, як фарміравалася, акрэслівалася тэхналогія кнігавыдання. Знешні выгляд і адметнасці гэтага механізма творца запазычыў, падгледзеў у Маскоўскім гістарычным музеі, дзе захоўваецца ўзорны стан. Там жа ёсць і апісанне дэталяў станка. Калі спрасціць, то ён складаецца з двух слупоў, змацаваных перакладзінамі, што фіксуюцца з дапамогай кліноў; паміж імі — прэс, які прыводзіцца ў рух рычагом і перадае на паперу ціск.

— Вельмі важна было, каб знешне станок быў падобны на гутэнбергаўскі і працаваў. Дзякуючы гэтаму прадмету сёння мы можам уявіць, як пачыналася беларускае кнігавыданне і які механізм наш першадрукар Францыск Скарына ўзяў за аснову ў сваёй працы, — дадае Юрый Сухаў.

Дарэчы, падобны стан, выраблены мастаком, знаходзіцца і ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

У пачатку верасня з Дзяржаўнага гістарычнага музея Масквы ў Мінск «завітае» пражскае выданне Бібліі Скарыны 1517 года, але часткі гэтай кнігі беларусы могуць пабачыць і нават пагартаць ужо сёння. Праўда, у выглядзе высокатэхналагічнага макета.

— На гэтым работа па папаўненні інтэрактыўнага кніжнага фонду не скончылася, будзем алічбоўваць іншыя старыдрукі з нашай калекцыі, дапаўняць кнігазбор картамі, — кажа **намеснік дырэктара гістарычнага музея Аляксандр ХРАМОЙ.** — Так наша спадчына становіцца бліжэйшай, і мы маем магчымасць пабачыць нават тыя рэчы, што знаходзяцца далёка ад Беларусі, але з'яўляюцца часткай нашай гісторыі і культуры.

Са спадчынай Скарыны наведвальнікаў музея пазнаёміць і новы інфакіёск. Тут, на інтэрактыўнай старой карце, можна ўбачыць месцы, дзе бываў і працаваў першадрукар, а на новай карце пазначаныя гарады, дзе ёсць помнікі выдатнаму асветніку.

Сімвалічна, што хутка новыя тэхналагічныя распрацоўкі з гістарычнага музея будуць прадстаўленыя на радзіме першадрукара. Іх пабачаць наведвальнікі Свята беларускага пісьменства ў Полацку.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*



Высокатэхналагічны макет скарынаўскай Біблії дазваляе кожнаму пабачыць адметнасці гэтай старажытнай кнігі.

## НА РАГАТАГА І ЦЕЦЕРУКА

**У краіне распачалося паляванне на лася, высакароднага і плямістага аленя, лань (да 30 верасня ўключна) і цецерукоў (да другой нядзелі снежня).**

З капытных допускаецца здабыча дарослых самцоў, а таксама селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту, спосабы — з засады, з падыходу. Дазваляецца выкарыстанне наразной гладкаствольнай і кідальнай паляўнічай зброі.

Птушак можна здабываць у светлы час сутак любога полу і ўзросту, акрамя старак — самак, якія водзяць вывадак маладняку. Дазволены зброевы спосаб палявання з падыходу толькі з паляўнічымі сабакамі. Можна выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю з патронамі з дробам.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## МЕЦЭНАТЫ Ў АДУКАЦЫІ

**Першы ў Беларусі дзіцячы сацыяльны IT-лагер прайшоў у санаторыі «Машынабудаўнік» пад Гомелем.**

Дабрачынны лагер з IT-кірункам даў магчымасць амаль сотні дзяцей з усёй Беларусі глыбей пазнаёміцца з інфармацыйнымі тэхналогіямі. Хлопчыкаў і дзяўчынак з невялікіх гарадоў і вёсак, SOS-вёскі Бараўляны, маючых статус бежанцаў з Сірыі і Украіны, а таксама навучэнцаў Гомельскага абласнога палаца дзяцей і моладзі на тыдзень пад Гомелем сабралі кампанія EPAM і асацыяцыя «Адукацыя для будучыні». Ментары-валанцёры правядзілі заняткі згодна з новай праграмай «Junior Ignite Camp». Майстар-класы, у якіх дзеці прымалі ўдзел, былі прысвечаны робататэхніцы, стварэнню электроннай музыкі і інш.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Стройтрест №4»**

**Лот №1**

1.А 1/к Административное здание с инв. № 500/С-21612. Общая площадь – 294,0 кв. м. Г.п. – 1966. Этажей – 1. Составные части и принадлежности: литер а — проезд, литер б, в, г — площадка, литер д — площадка под навес с кран-балкой, литер е — площадка под оборудование, литер ж — площадка для мойки автомобилей, литер и — эстакада, литер к — лестница, литер л — газон, литер м — подпорная стена 0,20, литер н — подпорная стена 0,40, литер п — бордюр 0,16, литер р, с — ограждение, литер т — ворота откатные, литер у — ворота распашные, литер ф – калитка. Адрес: г. Минск, ул. Железнодорожная, 25.
2. Здание вулканизации (Б1-2/к) с инв. № 500/С-21634. Г.п. – 1966. Этажей – 1-2. Общая площадь – 270,8 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Железнодорожная, 25/1.
3. В 1/к Гараж с инв. № 500/С-21633. Общая площадь — 328 кв. м. Г.п. – 1966. Этажей – 1. Адрес: г. Минск, ул. Железнодорожная, 25/2.
4. Д 2/к Здание производственно-бытового корпуса с инв. № 500/С-21632. Общая площадь — 416 кв. м. Г.п. – 1966. Этажей – 2. Адрес: г. Минск, ул. Железнодорожная, 25/3.
5. Г 1/к Склад с инв. № 500/С-16720. Общая площадь — 511 кв. м. Г.п. – 1961. Этажей – 1. Адрес: г. Минск, ул. Железнодорожная, 25/4.
6. Ж 1/к Склад с инв. № 500/С-16722. Общая площадь — 88 кв. м. Г.п. – 1961. Этажей – 1. Адрес: г. Минск, ул. Железнодорожная, 25/5.
7. Е 1/к Здание мастерских с инв. № 500/С-21556. Общая площадь — 490 кв. м. Г.п. – 1966. Этажей – 1. Адрес: г. Минск, ул. Железнодорожная, 25/6.
8. Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть с инв. № 500/С-1021435. Г.п. 1966. Составные части и принадлежности: литер А — участок водопроводной сети. Протяженность линейного сооружения — 5,5 м. Адрес: г. Минск, ул. Железнодорожная, 25 (ВрК-1- здание).
9. Хозяйственно-бытовая канализационная сеть с инв. №500/С-1021434. Г.п. — 1966. Составные части и принадлежности: литер А — участок канализационной сети. Протяженность линейного сооружения — 166,7 м. Адрес: г. Минск, ул. Железнодорожная, 25 (КбК-1-КбК-7).

**Начальная цена** — 1 430 391,70 бел. руб. **Задаток** – 143 039,17 бел. руб. **Шаг аукциона** 5%

ОБРЕМЕНЕНИЯ

Часть здания с инв. № 500/С-21612 сдается по договорам аренды: —18,05 кв. м. по 31.12.2017; — 5,65 кв.м на неопределенный срок; — 16,6 кв. м по 31.12.2017; — 14,9 кв. м по 30.10.2017. Часть гаража с инв. №500/С-21633 сдается по договорам аренды: — 65,6 кв. м на неопределенный срок; — 131,08 кв. м по 30.09.2017; — 132 кв. м по 08.11.2017. Часть здания с инв. № 500/С-21632 сдается по договорам аренды: — 51,9 кв. м и 8,9 кв. м по 31.12.2017. Часть склада с инв. №500/С-16720 сдается по договорам аренды: — 14,4 кв. м по 30.09.2017; — 28,4 кв. м по 31.12.2017; — 36,3 кв. м по 31.12.2017; — 38,8 кв. м по 31.12.2017; 14,1 кв. м по 30.09.2017; — 15,1 кв. м по 30.09.2017; — 48,6 кв. м по 31.12.2017. Часть склада с инв. №500/С-16722 сдается по договору аренды 34,5 кв. м по 30.10.2017. Часть здания мастерских с инв. №500/С-21556 сдается по договорам аренды 52,5 кв. м и 66,2 кв. м по 31.12.2017

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Земельный участок площадью 1,3018 га с кадастровым номером 500000000005002047. Целевое назначение земельного участка: для эксплуатации и обслуживания здания административно-хозяйственного по ул. Железнодорожной, 25, здания многофункционального по ул. Железнодорожной, 25/3, здания специализированного автомобильного транспорта по ул. Железнодорожной, 25/2, зданий специализированных складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ по ул. Железнодорожной, 25/4, 25/5, зданий неустановленного назначения по ул. Железнодорожной, 25/1, 25/6. Право аренды на срок по 30.11.2048. Ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в санитарно-защитных полосах водоводов: Охранная зона водопровода, площадь 0,0223 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

***Обременения:*** На земельном участке с кадастровым номером 500000000005002047 сданы в аренду открытые площадки: — 300 кв. м по 31.12.2017; — 42,5 кв. м по 30.12.2017; — 75,5 кв. м по 30.09.2017; — 20 кв. м по 31.12.2017; — 15 кв. м по 14.08.2018; — 7 кв. м по 31.03.2018

**Аукцион состоится 26.09.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Стройтрест №4», проводимом 26 сентября 2017 г.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 22.09.2017 в 11.00. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта — начальник базы Цопот Владимир Васильевич, тел. 8 029 399 13 61.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 www.ino.by e-mail: torgi@ino.by**

■ Дапамога

# Эканоміка дзяржаў пачынаецца з чалавечнасці



**Беларусь і Японію падзяляе больш за 8 тысяч кіламетраў, рознасць культур і менталітэтаў, узроўняў развіцця эканомікі, моўныя бар'еры і многія іншыя фактары... Але, як высветлілася, вельмі шмат і таго, што аб'ядноўвае нашы краіны. У 1986 годзе Беларусь пацярпела ў выніку тэхнагеннай катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, праз 25 гадоў бяда здарылася ў Японіі.**

**ДАВЕДКА. 11 сакавіка 2011 года. Буйная радыяцыйная аварыя максімальнага 7-га ўзроўню па Міжнароднай шкале ядзерных падзей адбылася ў Фукусіме ў выніку наймацнейшага ў гісторыі Японіі землятрусу і цунамі, які рушыў за ім. У выніку тэхнагеннай катастрофы больш за 300 тысяч чалавек прызнаныя пацярпелымі і апынуліся ў зоне павышанага ўзроўню радыяцыі.**

Беларусь была адной з першых краін, якія сутыкнуліся з наступствамі падобнай трагедыі. Валодаючы ўнікальным вопытам у сферы радыяцыйнай медыцыны, неабходнымі для своечасовай дыягностыкі сродкамі, Беларусь паспяшалася аказаць дапамогу Японіі.

Спецыяльная рэабілітацыйная праграма для дзяцей, якія пацярпелі ў выніку радыяцыйнага выпраменьвання пры выбуху на Фукусімскай АЭС, распрацаваная па ўказе Прэзідэнта Беларусі ў рамках Пагаднення аб супрацоўніцтве ў галіне пераадолення наступстваў аварый на атамных электрастанцыях, сёлета адзначае свой пяцігадовы юбілей. З пачатку рэалізацыі праекта (2012 год) дапамогу ў аздараўленні і пераадоленні наступстваў радыяцыйнага выпраменьвання ўжо атрымала больш за 500 чалавек. Толькі ў гэтым годзе на базе НДЦ «Зубраня» санаторна-курортнае лячэнне прайшло амаль 100 дзяцей з прэфектур Міягі і Фукусіма.

Рэабілітацыйная праграма ўключае поўнае медыцынскае абследаванне на базе Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы, абследаванне спецыялістамі рухомай радыеметрычнай лабараторыі, а таксама інтэнсіўны курс аздараўленчых мерапрыемстваў, які падбіраецца індывідуальна для кожнага і рэалізуецца на базе Нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Зубраня».

Праект дапамогі дзецям, якія пацярпелі пры выбуху на Фукусімскай АЭС, ужо атрымаў шырокую вядомасць у Японіі. Толькі сёлета з мэтай развіцця далейшага супрацоўніцтва Беларусь наведалі адразу некалькі незалежных дэлегацый. Адна з іх — на чале з членам Палаты саветнікаў парламента Японіі Масака Моры, якая падкрэсліла: «Ужо многія гады дзеці з Фукусімы прыязджаюць на аздараўленне ў Беларусь. Гэты праект з'явіўся вельмі важным элементам развіцця адносін з Японіяй па ўсіх напрамках: як у плане эканомікі, палітычных адносін, так і ў плане ўсіх астатніх аспектаў супрацоўніцтва».

Па ініцыятыве пасольства Японіі ў Рэспубліцы Беларусь у супрацоўніцтве з выдавецтвам «Дело (Восток + Запад)» сёлета была заснаваная пазачарговая эксклюзіўная прэмія «Чалавек справы» ў намінацыі «За паспяховае ажыццяўленне дабрачыннага праекта, які ўмацоўвае пазітыўны імідж Беларусі ў свеце». Яе ўладальнікам стаў дырэктар СТАА «Гейм Стрым» Віктар Навачадаў.

**Сяргей РАХМАНАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, пасол Рэспублікі Беларусь у Японіі (2011— 2016):** «Вельмі важна, што праект своечасова быў падтрыманы на ўзроўні прыватнага бізнесу *(з 2015 года ён рэалізуецца пры падтрымцы СТАА «Гейм Стрым». —* **Аўт.**) Людзі, якія гэта зрабілі, мысляць глабальна. Гэтая дапамога была не толькі своечасовай — яна была маштабнай. Гэта вельмі яскравы прыклад, як у нас прынята казаць, дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Калі ідэя — за дзяржавай, а прыватны бізнес яе падтрымлівае і пашырае.

На працягу апошніх пяці гадоў мне даводзілася сустракацца з чыноўнікамі вельмі высокага ўзроўню, уключаючы імператара і імператрыцу Японіі. Яны былі інфармаваныя аб гэтым праекце і таксама вельмі дзякавалі за гэта. Праект адыграў вельмі важную ролю ў развіцці беларуска-японскіх адносін і працягвае адыгрываць. Для таго каб развіваць эканоміку, трэба развіваць гуманітарнае супрацоўніцтва».

**Хірокі ТАКУНАГА, пасол Японіі ў Рэспубліцы Беларусь:** «Ад імя пасольства Японіі ў Рэспубліцы Беларусь я выказваю глыбокую падзяку за падтрымку гэтага праекта, а таксама спадзяюся на яго працяг у будучыні».

**Віктар НАВАЧАДАЎ, дырэктар СТАА «Гейм Стрым»:** «Самае страшнае — калі ад радыяцыі пакутуюць дзеці. І каб, па меры магчымасці, хоць у нейкай частцы дапамагчы ім пераадолець страшныя наступствы радыяцыйнага ўздзеяння, мы падтрымалі шматгадовы спонсарскі праект па аздараўленні японскіх дзяцей з Фукусімы ў Беларусі. Калі яны прыязджаюць у нашу краіну, атрымліваюць тут вельмі неабходныя ім догляд, клопат і лячэнне».

...Ацаніць рэальныя наступствы радыяцыйнага выпраменьвання ў выніку аварый на атамных электрастанцыях Чарнобыля і Фукусімы эксперты не бяруцца па цяперашні дзень. Дзякуючы названаму праекту дзясяткі японскіх дзяцей, якія пацярпелі ў выніку радыяцыйнай катастрофы, штогод вяртаюцца з нашай краіны дадому больш шчаслівымі, а сам праект ужо стаў адным з найважнейшых крокаў на шляху да збліжэння Беларусі і Японіі.

**Яна ЦЫДЗІК.**

# ПРЫЙШОЎ НА ПАЛЕТКІ КАМБАЙН...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па дарозе да цэнтральнай сядзібы калгаса — аграгарадка Рацічы — назіраю за вялікім хлебным полем. На апошнім участку сабрана большая частка тэхнікі, якая ні на хвіліну не спыняецца. Скошаныя палеткі аблюбавалі рэдкія птушкі. Літаральна перад аўтамабілем з зямлі падняўся вялікі сокал. Побач прыкмецілі яшчэ аднаго. Убачыць дзікіх жывёл і птушак тут — справа звычайная, кажуць мясцовыя жыхары. Непадалёку знаходзіцца заказнік «Аўгустоўская пушча».

Праўда, сёння жыхароў Раціч больш хвалюе не жураўель у небе, а камбайн на палетках. Гаспадары ведаюць, як толькі ў калгасным жніве будзе пастаўлена кропка, тэхніка адразу прыйдзе на іх участак. Такая практыка склалася не адным дзесяцігоддзем. І ў гаспадарцы сваіх вяскоўцаў не падводзяць.

Завіталі да Іосіфа Бужынскага. Па ўсім відаць, гаспадар: і дом, і гумно, і падвал — усё дагледжана. Нават ёсць зернеачышчальнік. Кажуць, што яго можа любы аднавясковец папрасіць, гаспадар нікому не адмовіць.

У гэтым годзе зерне як ніколі чыстае, заўважае Іосіф Бужынскі. Мабыць, ад таго, што выконваецца севазварот. Летась тут расла бульба, сёлета — змянілі на трыцікале. Цікаўлюся, куды ідзе зерне? Аказалася, што на корм свінкам і курам. Выгаду падлічыць нескладана. З трох мяхоў насення можна атрымаць больш за тону зерня, а гэта ўжо дзесяць мяхоў. Усе акупіцца нават з улікам платы за работу камбайна. У калгасе ўстанавілі такі тарыф: 45 рублёў за гадзіну працы. Гэтага хапае на любы прыватны ўчастак.

— Калі ёсць соткі, іх не кінеш, каб травой зарасталі, — разважае Іосіф Бужынскі, — тым больш што за зямлю плаціць пенсіянерам не трэба. Вось і працуем, пакуль сілы ёсць...

Мар'яна Герасімік з суседняй вуліцы адразу кінулася да галоўнага агранома з пытаннем: ці хутка ім чакаць калгаснага камбайнера. Свае 20 сотак яна засеяла азімай пшаніцай. Усё пойдзе на корм свойскай птушкі. Жанчына ўспамінае, як у маладосці ёй даводзілася жаць уручную, малаціць і нават малоць. Жорны да гэтага часу стаяць у гумне.

— Яшчэ не так даўно ў суседняй вёсцы быў млын, куды вазілі зерне малоць, — кажа Мар'яна Іосіфаўна, — але хлеб з гэтай мукі не пякуць, толькі на камбікорм.

«Ці не высокі кошт за ўборку камбайнам?» — задаю пытанне. Пенсіянерка парыруе: «А што сёння таннае? За ўсё трэба плаціць». У сваю чаргу заўважае, што работа за гэтыя грошы выконваецца якасна. Гаспадары задаволены.

**Васіль ГУСТЫР, старшыня СВК «Свіслач»:**

— Мы не выдзяляем прысядзібных участкаў, бо ў нас уся зямля ў севазвароце. Мы пайшлі па шляху забеспячэння сваіх работнікаў і пенсіянераў бясплатным зернем. Так, кожны камбайнер атрымлівае 1 тону зерня, трактарысты і даяркі — 900 кг, усе спецыялісты і паляводы — па 800 кг, пенсіянеры — па 400. Таксама ў гаспадарцы можна набыць пшаніцу па дзяржаўнай цане — 33 капейкі за кілаграм.



Камбайнёр Алег ЮНАКОЎ.

**Генадзь АКСАМІТ, першы намеснік старшыні Гродзенскага райвыканкама:**

— У Гродзенскім раёне ўборка збожжавых набліжаецца да фінішу. Так ці інакш, але часам прыходзіцца прыстасоўвацца да нюансаў надвор'я. У выніку дакладнай і зладжанай работы ўдалося не толькі вырасціць добры ўраджай, але і сабраць яго. Па раёне намалот складае 76,5 ц/га, што больш за мінулагодні на 16 ц/га. Валавы збор чакаецца на 20% вышэйшым за леташні. Упершыню адразу тры гаспадаркі раёна — ВК імя В. І. Крамко, СВК «Прагрэс-Верцялішкі», СВК «Свіслач» — намалацілі з кожнага гектара больш за 100 цэнтнераў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

■ Жніво-2017

## Віцебскія аграрыі супраць непагадзі

**Беларускім аграрыям застаецца ўбраць яшчэ 8,1% пасяўных плошчаў, каб завяршыць жніво. Паводле аператыўнай інфармацыі Мінсельгасхарча, на 24 жніўня ў краіне намалочана 7098,6 тысячы тон збожжавых і зернебабовых культур пры сярэдняй ураджайнасці ў 35,7 ц/га. Некаторыя раёны ўжо завяршылі ўборачныя работы, аднак надвор'е зноў сказала сваё важкае слова і прымусіла запаволіцца на гэтым тыдні аграрыяў у паўночных рэгіёнах краіны.**

Так, па інфармацыі абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў АПК, праліўныя дажджы прыпынілі ход уборачнай кампаніі ў Віцебскай вобласці. Выбарачнае жніво ішло па захадзе вобласці: у Браслаўскім, Верхнядзвінскім, Глыбоцкім, Докшыцкім і Мёрскім раёнах, аграрыі якіх змаглі прайсці за суткі ад 200 га да 400 га. Перыядычна з-за дажджу камбайны прастойвалі. Спецыялісты падбіраюць «часавыя вокны» для працы — людзі і тэхніка ўвесь час застаюцца ў стане гатоўнасці. На раніцу 24 жніўня ў Віцебскай вобласці намалочана 728,9 тысячы тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 32,2 ц/га. Аграрыям вобласці засталося ўбраць збожжа яшчэ з 32,5% плошчаў. Найбольшая колькасць камбайнераў-тысячнікаў працуе ў Аршанскім раёне, дзе іх 47. У Дубровенскім — 17, Віцебскім — 14, Талачынскім — 13. Экіпажаў-двухтысячнікаў у рэгіёне пакуль чатыры. Пакуль яшчэ адзіны камбайнер-трохтысячнік працуе ў Аршанскім раёне.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*




# УСЕ НА ПОЛЕ!

## Прафсаюз дапаможа хлебаробам на ўборцы ўраджаю

**Дапамагаць збіраць агародніну і садавіну, сушыць зерне, нарыхтоўваць салому і лён будуць па ўсёй краіне там, дзе ў гэтым ёсць неабходнасць.**

Сёння больш за 30 прафсаюзных актывістаў Гомельскай вобласці адправяцца збіраць ураджай агародніны на прадпрыемства «Усход» (Гомельскі раён). На Віцебшчыне прадстаўнікі прафесійных аб'яднанняў Дубровенскага і Аршанскага раёнаў, а таксама Віцебскай вобласці правядуць дзень на Дубровенскім ільнозаводзе. Каля 70 чалавек выйдуць у поле, каб сабраць лён у стужкі. У Магілёўскай вобласці 40 добраахвотнікаў будуць задзейнічаны на палях фірмы «Вейна» (Магілёўскі раён). Сёлета тут добры ўраджай буракоў і морквы, таму працоўныя рукі лішнімі не будуць. А Брэсцкі прафсаюзны актыў сёння адправіцца ў Жабінкаўскі раён, у гаспадарку «Азяты Агра», дзе зоймецца нарыхтоўкай саломы.

З першых дзён уборачнай кампаніі прафсаюзныя спецыялісты рэгулярна выязджалі на палі, маніторылі, ці забяспечаны хлебаробы гарачым харчаваннем і спецадзеннем і наколькі аператыўна вырашаюцца праблемы. Сярод частых парушэнняў — эксплуатацыя абсталявання, якое не адпавядае патрабаванням бяспекі, невыкананне правілаў аховы працы пры рамонце ў механічных майстэрнях. Там, дзе была неабходнасць, прафсаюзы дапамагалі набываць маразільнікі, адмысловыя кантэйнеры для дастаўкі гарачага харчавання, бойлеры для душавых і сталовых, спецадзенне і абутак.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ У эфіры

# ЗНАЙСЦІ «КЛЮЧ ДА ГЛЕДАЧА»

## Пяцёрка самых яркіх майстроў ток-шоу

**Уменне трымаць увагу аўдыторыі, хутка рэагаваць на заўвагі рэжысёра, гатоўнасць справіцца з любой непрадказальнай сітуацыяй. А яшчэ — неверагодная сканцэнтраванасць, гранічная ўпэўненасць і моцная вера ў правільнасць таго, што ты робіш, і ў тое, што ў цябе ўсё атрымаецца. Думаецца, такімі якасцямі павінен валодаць чалавек, які працуе ў прамым тэлеэфіры. А яшчэ, безумоўна, ён мусіць умець весці гутарку з кожным гледачом і адначасова — «з народам усім», быць тактоўным і шчыра зацікаўленым у асобе суразмоўніка. Многія прафесійныя журналісты прызнаюцца, што інтэрв'ю — жанр досыць інтымны, тое, наколькі шчырай і змястоўнай атрымаецца гутарка ў выніку, залежыць і ад ступені даверу паміж суразмоўнікамі, і ад умення правільна выбудоўваць дыялог. І калі ў тэлепраграмах, якія транслююцца ў запісе, многія недахопы можна выправіць мантажом і запісам некалькіх дубляў, то той, хто працуе ў прамым эфіры, ад самага пачатку не мае права на памылку. Тым больш калі гаворка ідзе пра жанр тэледыялогу, або ток-шоу. Гэта, так бы мовіць, вышэйшы пілатаж. Таму вядучых, якія сталі вядомымі менавіта дзякуючы ток-шоу ў прамым эфіры, можна назваць сапраўднымі зоркамі прафесіі. Сёння згадаем некаторых з найярчэйшых.**

### ЛАРЫ КІНГ



«Дарога да поспеху — у побыце ці прафесійнай дзейнасці — складаецца з размоў, і, калі вам не стае ўпэўненасці ў зносінах, дарога гэтая можа аказацца ўхабістай», — так лічыць сапраўдны кароль дыялогу, які амаль чатыры дзесяцігоддзі прысвяціў рабоце ў жанры тэле- і радыёінтэрв'ю, Лары Кінг. Гасцямі яго праграм лічылі за гонар быць самыя вядомыя палітыкі, акцёры, бізнесмены, спартсмены. Ён умее знайсці выйсце з абсалютна любога тупіка размовы і пачаць дыялог з абсалютна любым чалавекам. Яго асоба стала напраўду легендай, а лёс — увасабленнем «амерыканскай мары».

Просты хлопчык Лоўрэнс Харві Зейгер з Брукліна, які з-за ранняй смерці бацькі вымушаны быў кінуць вучобу і пайсці працаваць, каб забяспечваць сям'ю, выпадкова трапіў на радыё. Спачатку працаваў там прыбіральшчыкам, выконваў дробныя даручэнні. А неяк, калі вядучы не змог выйсці ў эфір, паспрабаваў яго падмяніць. Праграма так спадабалася кіраўніцтву, што хутка юнак стаў радыёвядучым, а псеўданім сабе выбраў (бо кіраўніцтва палічыла яго імя складаным для вымаўлення і запамінання), выпадкова пабачыўшы рэкламны лісток лікёра King's Wholesale Liquor. З цягам часу пачаў весці ўласнае шоу і стаў адным з самых папулярных радыёвядучых Фларыды. Атрымаў прапанову паспрабаваць сябе на тэлебачанні...

Імя Лары Кінга сёння асацыюецца не толькі з тэлебачаннем, але і з адметным «фірменным» стылем адзення, ветлівай хітраватай усмешкай, пісьменніцкай працай, акцёрскай дзейнасцю. Ён з'яўляецца ў кіно, прычым нярэдка, у ролі самога сябе. Яго таксама можна назваць і настаўнікам, выхавальнікам многіх журналістаў: кнігі Лары Кінга, прысвечаныя мастацтву інтэрв'ю, можна назваць сапраўднымі падручнікамі. Нездарма ж адна з іх — «Як размаўляць з кім заўгодна, калі заўгодна і дзе заўгодна» — вытрымала ўжо дзясяткі выданняў і не выходзіць са спісаў бестселераў.

Дарэчы, беларусы маюць яшчэ адну нагоду больш пільна сачыць за творчасцю Кінга — яго маці Джэні родам з беларускіх земляў.

### ОПРА УІНФРЫ



У дзяцінстве бабуля яе часта біла. У 14 дзяўчына зацяжарыла, але дзіця пасля нараджэння памерла. У 17 яна працавала і адначасова вучылася ва ўніверсітэце, была самым маладым рэпарцёрам мясцовых СМІ, а ўжо ў 32 стварыла ўласнае «Шоу Опры Уінфры», якое выходзіла ў эфір цягам 25 сезонаў.

Сапраўды, яе жыццё — прыклад сілы волі, імкнення ісці ўласным шляхам і нягледзячы на ўсе перашкоды дасягаць вышыняў. Яна — прыклад веры ў сябе і ў станоўчыя моманты жыцця, прыклад удзячнага стаўлення да лёсу і павагі да каманды, у якой працуе. Уінфры неадназова атрымлівала званне самай уплывовай жанчыны ў шоу-бізнесе і ў свеце, стала першай у гісторыі чарнаскурай жанчынай, якая зарабіла мільярд долараў. Таму невыпадкова вобраз і вопыт Опры натхняюць мільёны жанчын, а сама вядомая тэлевядучая з радасцю дзеліцца сакрэтамі поспеху і майстэрствам самаразвіцця ў сваіх кнігах. А яшчэ — яна прапагандуе клопат пра здароўе, адмову ад эгаізму і важнасць унутранага свету, а таксама неабходнасць імкнення да поспеху. Яго, лічыць Опра, можа дасягнуць кожны.

Яна раіць: «Зрабіце адну рэч, пра якую вы думаеце, што не зможаце зрабіць. Пацерпіце няўдачу — паспрабуйце яшчэ раз. Ужо атрымаецца лепш. Толькі тые не цэрпяць паражэнняў, хто не спрабуе ўзняцца на большую вышыню».

### УЛАДЗІСЛАЎ ЛІСЦЬЕЎ




Калі яго забілі, многія з нас яшчэ толькі вучыліся ў пачатковай школе. Мы не маглі зразумець усяго маштабу трагедыі, але ўжо цяпер, гледзячы паасобныя выпускі праграм, якія ён вёў і якія ствараў, можам ацаніць, што разам з Лісцьевым сышла цэлая часткa гісторыі расійскага тэлебачання. Ён імкнуўся да прафесійнага, адданага справе паказу праўды, цвярозага і аналітычнага погляду на падзеі і свет.

Каля дзясятка кніг і больш як два з паловай дзясяткі фільмаў — тыя праекты, якія калегі-журналісты і ўжо прадстаўнікі наступных пакаленняў прафесіі прысвяцілі гэтаму выдатнаму чалавеку. Ён стварыў адно з самых першых на тэрыторыі СССР ток-шоу «Тэма», у эфіры якога ўздымаліся вострыя сацыяльныя і палітычныя пытанні, стаяў каля вытокаў палітыка-аналітычных праграм «Гадзіна пік» і «Погляд». Аўтар праекта «Поле цудаў», які і сёння карыстаецца папулярнасцю на тэлебачанні.

Нядобразычлівцы кажуць, што ён не быў першапачаткова таленавітым вядучым, проста навучыўся, развіў у сабе пэўныя ўменні. Проста развіў і стаў адным з найлепшых у свой час? Ці не парадаксальна гучыць?

«Безумоўна, ён валодаў галоўным талентам вядучага, а менавіта — уменнем «прабіць» экран і аказаць побач з кожным асобна ўзятым гледачом, — успамінае яго калега Уладзімір Познер. — Кожны раз, калі ён быў вядучым, праграма атрымлівала неверагодна вялікую папулярнасць. Ён знайшоў ключ да гледача, умеў яго зацікавіць і рабіў гэта ў высокай ступені прафесійна».

### УЛАДЗІМІР ПОЗНЕР



«Стоячы перад Богам, што вы яму сказалі б?» Прыхільнікі Уладзіміра Познера ведаюць, што знакаміты журналіст, аналітык любіць задаваць сваім суразмоўнікам гэтае пытанне апошнім. Але ж сам адказу на яго пазбягае. Натуральна, у інтэрв'ю з ім яно таксама часта гучыць. Нягледзячы на амаль зорны статус, адсутнасць часу, Познер рэдка адмаўляецца ад гутарак з калегамі і стараецца з увагай і ўважлівасцю адказаць на ўсе пытанні.

Нарадзіўся ў Парыжы, працаваў і працуе ў ЗША і Расіі, шмат вандруе, цікавіцца вострымі тэмамі з розных сфер жыцця. Аўтар многіх аналітычных праграм, выдатных падарожных цыклаў (варта толькі ўспомніць яго вандроўкі па свеце разам з калегам Іванам Ургантам), глыбокіх кніг... За кожным яго праектам — мудрасць, вопыт, шырыня поглядаў і жаданне выказваць аб'ектыўныя думкі, разумець кожнага. Таму многія лічаць Познера «сваім», прыслухоўваюцца да яго меркавання. Думаю, мэтр журналістыкі гэтага сапраўды заслугоўвае.

### ЯГОР ХРУСТАЛЁЎ

Некаторы час у беларускай тэлевізійнай тусоўцы яго называлі ледзь не здраднікам. Маўляў, не захацеў і надалей развівацца на радзіме, прадстаўляць новыя праекты, а замест гэтага падаўся ў больш перспектыўную і прыбытковую расійскую тэлекампанію. Але праз пяць гадоў Ягор вярнуўся ў Мінск з новымі ідэямі. За некалькі гадоў рэалізаваў шэраг задумак на розных каналах, паспеў папрацаваць з прадзюсарскім цэнтрам і нават атрымаў «Тэлевяршыню» ў адной з персанальных намінацый. Так, яму даравалі «здраду» калегі, а гледачы — зноў прынялі з любоўю і шчырай радасцю.



Думаецца, што тут сыграла ролю тая самая карта прафесіяналізму, высокага майстэрства работы ў прамым эфіры, пра якую ішла гаворка ў пачатку. Бо і старэнькая «Карамболь», якая ўжо больш за дзесяцігоддзе таму сышла ў нябыт, і новае «Што адбываецца», дзе Хрусталёў выступае ў якасці вядучага, паказваюць: ён умее акцэнтаваць увагу не толькі на гарачых тэмах, якія на слыху, не проста, як сёння кажуць, ловіць «хайп», але і ўздымае больш глабальныя, значныя пытанні, часам глыбока схаваныя за многімі слаямі сэнсаў.

У інтэрв'ю «Звяздзе» ён сам аднойчы распавёў: «Трэба ўнікаць у кожнае пытанне... Табе стане цікава, ты будзеш працаваць, а не адбываць нумар. Водгук абавязкова знойдзецца. Неабходна захапіцца нават самай сумнай тэмай, бо інакш нічога не атрымаецца».

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Не абмініце

### СВЯТА ПІСЬМЕНСТВА — ЦЭЛЫ МЕСЯЦ

**Тэлеканал «Беларусь 3» прапануе далучыцца да святкавання Дня беларускага пісьменства. Але адзначаць яго плануецца не некалькі дзён, а цэлы месяц — новымі цікавымі праграмамі, звязанымі з беларускай літаратурай і кнігавыданнем.**

Ужо праз тыдзень, 1 верасня, у эфір выйдзе спецыяльны святочны выпуск «Навін культуры» з Полацка, дзе будуць адбывацца асноўныя мерапрыемствы свята. Такія праграмы навін будуць з'яўляцца ў эфіры штодзень падчас святкавання. Гледачоў чакае серыя інтэрв'ю з вядомымі выдаўцамі, пісьменнікамі, літаратурнымі крытыкамі, а таксама пераможцамі Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Іх узнагародзяць менавіта ў гэтыя дні.

Сацыякультурны канал «Беларусь 3» падрыхтаваў цэлы шэраг знакавых праектаў. Так, у эфір выйдуць дакументальныя стужкі і тэматычныя праграмы па матывах твораў выдатных пісьменнікаў Янкі Маўра, Якуба Коласа, Івана Мележа, Івана Шамякіна.

Варта памятаць, што сёлета лейтматывам свята з'яўляецца 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, таму гледачы пабачаць гісторыка-біяграфічны фільм «Я, Францыск Скарына» («Беларусьфільм», 1969 год). А 3 верасня ў эфіры тэлеканала адбудзецца прэм'ера дакументальнага фільма «Першадрук», знятага сёлета на «Беларусьфільме». Ды і само свята пісьменства ў гэтым годзе стане тэмай для новай кінастужкі. У дні, калі Полацк будзе прымаць шмат гасцей, зацікаўленых айчыннай літаратурай, канал «Беларусь 3» пачне ствараць дакументальны праект, які ў хуткім часе прэзентуюць публіцы.

Сярод прэм'ер верасня — цыкл «Нататкі на палях», які аб'ядноўвае праграмы пра Францыска Скарыну, Міколу Гусоўскага, Паўлюка Багрыма, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Адама Міцкевіча, Янку Купалу, Якуба Коласа, Францішка Багушэвіча і многіх іншых выдатных творцаў. Распачне серыял праграма, прысвечаная Івану Мележу, якая выйдзе ў эфір ужо 2 верасня.

Нас чакае яшчэ адзін дакументальны серыял — чатырохсерыйны праект «Скарына». Абяцаюць, што гэта будзе не проста пералік фактаў пра жыццё і творчасць першадрукара, але ў першую чаргу погляд вучоных і журналістаў на шлях, дасягненні і белыя плямы ў біяграфіі Францыска Скарыны ■

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Выкарыстоўвайце добразычлівыя адносіны начальства. У сераду магчымы важныя званкі, пастарайцеся іх не прапусціць. Падалей трымайцеся ад рызыкоўных мерапрыемстваў і авантурных прапаноў. Лепш заняцца асваеннем чаго-небудзь новага — гэта дазволіць пашырыць як кругагляд, так і вашы магчымасці і паўнамоцтвы. Другую палову тыдня пажадана разгрузіць ці прысвяціць адпачынку.



**СКАРПІЁН.** У аўторак патрэбная інфармацыя, нібы залатая рыбка, сама прыплыве ў рукі. Калі прапусціце — будзе вельмі крыўдна. У сярэдзіне тыдня не звяртайце ўвагі на шэпат за плячамі і зайздросныя ўздыхі: сканцэнтруйцеся — і наперад, проста да мэты. Магчымы пэўныя цяжкасці, перад якімі не варта адступаць. І тады поспех проста непазбежны. Лепш абапірацца на правераныя метады, а нестандартныя падыходы выкарыстоўваць толькі як дадатак.



**СТРАЛЕЦ.** Горшыя часы засталіся ў мінулым! Вы з радасцю вернецеся да стваральнай працы і паўсядзённых клопатаў. Варта падрыхтавацца да нечаканых сустрэч з даўнімі сябрамі. Пазбягайце ўзаемных крыўдаў і прэтэнзій у зносінах з блізкімі. Цвёрдасць і рашучасць прывядуць да ажыццяўлення планаў. Але разлічваць давядзецца толькі на асабістыя сілы. Пазбягайце ўсяго тайнага і закуліснага, не дазваляйце ўцягваць вас у якія-небудзь інтрыгі. Асабістымі перажываннямі лепш дзяліцца толькі з самымі блізкімі і праверанымі людзьмі.



**КАЗЯРОГ.** Вы паступова пачынаеце заваёўваць поспех і папулярнасць. Неабходна здзейсніць маленькі подзвіг — разабрацца з усімі руціннымі справамі, якія назапасіліся. У панядзелак магчымы непрадбачаныя абставіны, якія могуць разбурыць усе планы на гэты дзень. А вось аўторак будзе ўдалы практычна ва ўсіх адносінах, асабліва, калі не будзеце рэзка і раптоўна змяняць рашэнні. У сераду не варта правакаваць канфліктныя сітуацыі. У чацвер можаце апынуцца ў няпростай сітуацыі — давядзецца абмінаць падводныя камяні. У выхадныя парадуйце сябе чым-небудзь.



**ВАДАЛЕЙ.** У пачатку тыдня верагодны цяжкасці ў зносінах з роднымі ці суседзямі. Аўторак — не самы ўдалы час для дэкларацыі новых ідэй на рабоце. Пачуццё няўпэўненасці будзе перашкаджаць засяродзіцца. У сярэдзіне тыдня магчымы прыезд родных, сяброў ці дзелавых партнёраў і клопаты, якія з гэтым звязаны.



**РЫБЫ.** У панядзелак, аказаўшы паслугу начальству, вы тым самым дапаможаце яму вырашыць складаную сітуацыю, і яно абавязкова аддзячыць вам. Серада нарэшце дазволіць адпачнуць ад праблем на рабоце і дома. Падумайце аб пашырэнні галін прымянення сваіх магчымасцяў, а таксама аб набыцці новых — навучанне новай спецыяльнасці дасць шанц уладкавацца на больш высокааплатную работу. Хатнія праблемы лепш вырашаць адразу, па меры іх з'яўлення, інакш яны будуць цягнуць назад.

# Чацвер, 31 жніўня

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.10, 10.05, 15.25, 16.30 Серыял «Каханне Надзеі». (12+).**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар (6+).
**11.40, 12.10, 20.00 Серыял «Пад абцасам». (16+).**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Позняе раскаянне». (16+).**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**22.00 Серыял «След». (16+).**
**0.35** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «Вышук-2». Заключная серыя (16+).**

## Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца (12+).
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 18.50 Меладрама «Жамчужына палаца». (12+).**
**11.25** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам. (16+).
**12.00** «Бітва экстрасэнсаў». 14-ы сезон. (16+).
**14.10** «Паненка-сялянка». (16+).
**15.20, 0.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.10** «Тата папаў». (16+).
**21.25** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.40** Футбол. Чэмпіянат свету — 2018. Кваліфікацыя. Люксембург — Беларусь.
**23.50** Футбол. Чэмпіянат свету — 2018. Кваліфікацыя. Агляд гульнявога дня.

## Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Языкі ў вушах.
**8.05, 12.00, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 14.30, 20.30, 23.10** «Гэты дзень».
**8.25, 18.05 «Узнятая цаліна». Драма, заключная серыя. (12+).**
**10.10, 14.35 «Нябесны ціхаход». Камедыя. (12+).**
**11.30** «Выйсце ёсць». Вольга Клебановіч (12+).
**12.50** «Незабыўны вечар бельканта». Канцэрт Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь.
**13.40** «Эпоха». Напалеон Орда.
**15.55** «Спіс Маргарыты». Дак. фільм (12+).
**16.35, 21.05 «Пяцёра з неба». Драма. (12+).**
**19.50** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.35 «Белы параход». Драма. (12+).**

## Беларусь 5

**7.35** Гандбол. SEHA-Газпром ліга. «Татран» (Славакія) — БГК імя Мяшкова (Беларусь).
**9.00** Хакей. КХЛ. «Слован» (Браціслава) — «Дынама-Мінск».
**10.55, 16.40** Дзюдо. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Жанчыны.
**15.30** «На шляху да ЧС-2018». Відэачасопіс.
**16.05** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
**19.10** Бокс. Чэмпіянат свету. Паўфіналы.
**20.45** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. «Цуг» (Швейцарыя) — «Нёман» (Беларусь). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**23.00** Спорт-цэнтр.
**23.10** Авертайм.
**23.45** Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат свету. Фіналы.

## АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!» (12+).
**10.15** «Смак» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.10** «Сам-насам з усімі» (16+).
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**14.15, 16.20** «Час пакажа» (16+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Бяспека» (16+).**
**23.00 «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Серыял (16+).**
**23.55** Канцэрт гурта «Чайф» (16+).
**0.50** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.30** «Тайны Чапман» (16+).
**9.25** «Далёкія сваякі» (16+).
**9.35, 17.35** «Званая вячэра» (16+).
**10.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30** «Глядзець усім!» (16+).
**11.50 «Студэнты». Серыял (16+).**
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**15.30** «Вадзіць па-руску» (16+).
**15.55** «Мінск і мінчане».
**16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання: «Тарас на Парнасе: літаратурны дэтэктыў».
**21.00** «Дзіўная справа» (16+).
**23.05** «Аўтапанарама» (12+).
**0.20** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**1.10 «Інструктар». Серыял (16+).**

## МІР

**6.00, 5.25** М/ф (0+).
**7.30** Добрай раніцы, свет! (16+).
**8.35** «Няма праблем» (16+).
**10.00** «Любімыя акцёры» (12+).
**11.25, 13.15, 1.15 Маст. фільм «Каханы Раджа» (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.25, 3.30** «Іншы свет» (12+).
**15.00** «Справы сямейныя» (16+).
**16.15** «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**17.10, 3.55 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.20 Серыял «Шапавалаў» (16+).**
**23.10 Маст. фільм «Папялушка.ру» (12+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «60 хвілін». Ток-шоу.
**12.45** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35, 20.40, 22.00 Серыял «Тайны следства» (12+).**
**15.25** «Пакой смеху» (16+).
**17.35 Серыял «Сваты» (16+).**
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым (12+).
**22.40, 23.10 Серыял «Ніткі лёсу» (12+).**
**0.35** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Дзелавая раніца НТБ» (12+).
**7.10, 8.05 Серыял «Таксістка» (16+).**
**8.55 Серыял «Вяртанне Мухтара» (16+).**
**9.45, 23.05** «НЗ.by».
**10.20, 19.40** Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**10.25 Серыял «Ляснік» (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных» (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05, 16.35** «Месца сустрэчы».
**17.30** «Следства вялі...» (16+).
**19.45 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Дэсант ёсць дэсант» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.55, 19.05, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** М/ф.
**7.45 Серыял «Вялікі перапынак» (12+).**
**8.45, 17.00 Серыял «Цёмная тэрыторыя» (18+).**
**10.15** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**10.45 Драма «Казіно».**
**13.45, 19.10 Серыял «Вікторыя».**
**15.00, 17.45 Серыял «Вербніца» (16+).**
**16.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**18.50** «Фэшн is my прафэшн».
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**21.10 Драма «Чорная архідэя».**
**23.05 Серыял «Станіца» (16+).**

## ВТБ

**6.00, 14.10** Серыял «Вароніны». (12+).
**8.00** «Ералаш». (6+)
**8.30, 4.20** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.50, 4.40** М/ф «Фіксікі». (0+)
**9.10, 5.00** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+)
**9.30, 23.10** «Уральскія пельмені». (16+).
**10.30** Фантастыка «Галодныя гульні: Сойка-Перасмешніца». Частка 1-я». (12+).
**12.40** «Дурні і дарогі». (16+).
**13.10, 20.00** Серыял «Мамачкі-3». (16+).
**16.20, 1.50** Серыял «Беглыя сваякі». (16+).
**17.20, 3.50** Серыял «Гэта каханне». (16+).
**17.50** Серыял «Кухня-6». (16+).
**21.00** Баявік «Місія невыканальная». (12+).
**0.00** Серыял «Тут нехта ёсць...» (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**2.40** «Лаві момант». (16+).
**3.00** «Не можа быць!» (16+).
**5.10** Серыял «Амазонкі». (16+).

## Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.20, 21.55** «Каломба». Серыял.
**11.55** «Абсалютны слых».
**12.35, 20.25** «Медычы. Хросныя бацькі Рэнесансу». Дак. серыял.
**13.35, 21.25** Сустрэча на вяршыні. «Гульні розуму з Тацццянай Чарнігаўскай».
**14.00, 1.55** Мсціслаў Растраповіч, Шарль Азнавур, Тэадор Гушльбаўэр і Страсбургскі філарманічны аркестр. Запіс 1995 года.
**15.10** «Тэлетэатр. Класіка». Аляксандр Бялінскі на ТБ.
**16.10** «Сяргей Пракудзін-Горскі. Расія ў колеры». Дак. фільм.
**17.05, 1.40** Сусветныя скарбы.
**17.20, 0.25** «Ад'ютант яго правасхадзіцельства». Маст. фільм.
**18.35** «Шарль Кулон». Дак. фільм.
**18.45** «Справа №. Героі адлігі: Твардоўскі і Салжаніцын».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** «Шукаю настаўніка». Дак. серыял.
**23.45** «Уладзімір Співакоў. Дыялогі з Саламонам Волкавым». Дак. серыял.
**2.50** «Уільям Гершэль». Дак. фільм.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Магія і перабудова». 2007 год (12+).
**7.00** Дак. фільм «Эцюд пра каханне» (12+).
**7.25, 8.45, 9.40, 11.00, 12.55, 14.25, 15.40, 17.00, 18.55, 20.25, 21.40, 23.00, 0.55, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.45, 13.20, 19.20** Маст. фільм «Гонкі па вертыкалі» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Тацццянай Візбар. 2008 год (12+).
**18.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «The Beatles». 2005 год (16+).
**0.00** «СеўАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Забароненая музыка». 2004 год (18+).
**1.10** Тэлеспектакль «Чалавек-невідзімка». 1977 год (16+).

## EuroSport 1

**4.00, 8.00, 11.00, 13.30, 19.00, 22.15, 2.15** Тэніс. US Open.
**9.30, 12.30, 15.00, 16.00** Веласпорт. «Вуэльта».
**15.45, 18.45** Веласпорт. «Вуэльта»-экстра.
**22.00, 2.00** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс».

## Кінакамедыя

**0.45** «Эйр Амерыка». Камедыя (16+).
**2.45** «Шэф». Камедыя (12+).
**4.15, 14.00** «Паміж намі». Скетчкам (16+).
**5.10** «Дзень радыё». Камедыя (16+).
**6.55** «Дзень сурка». Камедыя (12+).
**8.40** «Ліхтугі кітайца ў Кітаі». Прыгоды (16+).
**10.35** «Разумнікі». Камедыя (16+).
**12.15** «Былыя: найлепшыя сябры!» Меладрама (16+).
**14.25** «Шчаслівае сямейства». Камедыя (16+).
**16.00** «Дазвольце цябе пацалаваць... Бацька нявесты». Камедыя (16+).
**17.50** «Стаўка на каханне». Камедыя (12+).
**19.30** «Паспець за 30 хвілін». Камедыя (16+).
**21.00** «Наша Russia. Яйкі лёсу». Камедыя (16+).
**22.30** «Пяць нявест». Камедыя (16+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.30** «Шафа» (16+).
**8.15** «Доктар І...» (16+).
**8.45, 19.00** «Падарунак лёсу». Серыял (16+).
**10.25, 3.05** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.05** «Сляпая» (12+).
**13.05** «Варажбітка» (12+).
**14.10, 4.40** «Паралельны свет» (12+).
**15.05** «Трэндзі» (16+).
**15.35** «Здзелка» (16+).
**16.05** «Натуральны адбор» (12+).
**17.05** «Адкрыта» (12+).
**18.00** «Сіндром дракона». Серыял (16+).
**21.00** «Спатканне з зоркай» (16+).
**22.10** «Рэвізора» (16+).
**23.15, 5.30** «Алігарх ТБ» (16+).
**23.45** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.30** «Куды прыводзяць мары». Драма (12+).
**2.20** «Хэлоў, Раша!» (16+).

## ТБ1000

**6.10, 17.30** Дывергент-3: за сцяной (16+).
**8.35** Вялікая афёра (16+).
**10.55** Роўныя (16+).
**13.05** Чалавек, якога не было (16+).
**15.30** Твары ў натоўпе (16+).
**20.10** Пітэр Пэн (12+).
**22.25** Шукальнік вады (16+).
**0.40** Трусіная нара (16+).
**2.35** Салодкі лістапад (12+).
**5.00** Банды Нью-Ёрка (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Завея (16+).
**8.00** Брат (18+).
**10.00** Джэнтльмены, удачы! (12+).
**12.00** Дзікі сабака Дынга (6+).
**14.05** Ванечка (16+).
**16.20, 4.20** Грамадзянка Кацярына. Серыі 3—4-я (12+).
**18.20** Вайна полаў (16+).
**20.20** Брат 2 (18+).
**22.50** Мора (16+).
**0.35** У далёкім сорак пятым... Сустрэчы на Эльбе (18+).
**2.35** Атамны Іван (16+).

## National Geographic

**6.00** Гульні розуму. (12+).
**6.50** Зрабі або памры. (12+).
**7.10** Код небяспекі. (12+).
**7.35, 13.25, 5.45** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.55, 10.20, 14.55** Мегазаводы. (12+).
**8.45, 11.05** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**9.30** Дзікі тунец. (12+).
**11.50, 16.25, 19.30, 21.00, 1.10, 4.10** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**12.40, 18.45, 3.25** Больш, чым тыраназаўр. (12+).
**14.10** Чалавек супраць YouTube. (12+).
**15.40** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха. (12+).
**20.15** Аўта-SOS. (12+).
**21.45** Дзіяна: згубленыя кадры. (12+).
**23.40** Ліхтугі за мяжой. (16+).
**0.25** Сваіх не кідаем. (16+).

## Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Выжыць любой цаной. (12+).
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена? (12+).
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі. (16+).
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00** Пяцёрка найлепшых. (12+).
**17.00, 22.00, 6.20** Махінатары. (12+).
**18.00** Багажныя войны. (12+).
**1.00** Востраў. (16+).
**2.00** Зніклае золата. (12+).
**2.55** Кола: гульня на выжыванне. (16+).
**4.40** Маланкавыя катастрофы. (16+).

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск №25

Наш сённяшні госць — Чэслаў Якубоўскі з Мінска. Нарадзіўся Чэслаў Андрэевіч у 1944 годзе на Гродзеншчыне. Кандыдат тэхнічных навук, дацэнт БНТУ, у свой час выкладаў у Алжыры і Гвінеі, валодае французскай, нямецкай і польскай мовамі. Як складальнік задач заваяваў дзясяткі адзнак на конкурсах, у камандным першынстве Беларусі двойчы выканаў норму кандыдата ў майстры спорту па кампазіцыі (перамогі ў раздзелах трохходовак і кааператыўных матаў). Дарэчы, шахматамі захапляецца і ўнук Ч. Якубоўскага Даніла — у юнака першы разрад, ён склаў некалькі добрых задач.

Чэслаў Якубоўскі лічыць і пацвярджае на справе, што ў прывабныя для рашальнікаў задачы-мініяцюры (не больш за сем фігур) можна закласці даволі вялікі змест. Нездарма наступная яго задача заняла першае месца ў міжнародным конкурсе 2010 года на лепшую мініяцюру-трохходоўку.

**Белыя:** Крс7, Фh2, Kd5, Kf8, пп. с3, g5 (6).

**Чорныя:** Kpd3 (1).

Мат у 3 хады.

Аналіз кампазіцыі паказвае, што ў ёй маецца шэраг цікавых падманных слядоў: 1.Kpb6? Kpe4 2.Фh3 Kp:d5(Kpe5) 3.Фe6x, але 1...Kpc4!; 1.Kpd6? Kpe4 2.Фg3 Kpf5 3.Фf4x, але 1...Kpc4!; 1.Фf2? Kpe4 2.Фe3+ Kp:d5 3.Фd4x, 2...Kpf5 3.Фf4x, але 1...Kpc4!; 1.Фb2? Kpc4 2.Kf4 Kpc5 3.Фb4x, але 1...Kpe4! А рашэнне наступнае: 1.Ke6! Kpc4 2.Фa2+ Kpd3 3.Kc5x; 2...Kpb5 3.c4x; 1...Kpe4 2.Фe2+ Kp:d5 3.c4x, 2...Kpf5 Ke7x. Чатыры разы мяняецца гульня на ход чорных 1...Kpe4, двойчы — на ход 1...Kpc4, ёсць і шэраг іншых тэматычных нюансаў.

А гэтая задача таго ж аўтара атрымала ў свой час пяты прыз у конкурсе расійскага выдання «Рыбинск 7 дней».

**Белыя:** Kpf8, Фb4, Cb7, Kc3, пd2 (5).

**Чорныя:** Kpe5, пе6 (2).

Мат у 3 хады.

Рашае 1.Фh4! Kpd6 2.Kd5!, 1... Kpf5 2.Фh5+. Не вялі да мата спробы 1.Kpg7? Kpf5 2.Cf3 Kpe5! або 1.Kpe7? Kpf5 2.Фh4 Kpg6!

Што датычыцца наступнай задачы, то спачатку Ч. Якубоўскі стварыў яе версію пры васьмі фігурах, а потым здолеў зменшыць колькасць «ваяроў» на дошцы да сямі *(гл. дыяграму)*.



**Белыя:** Kpf3, Фc4, Ca2, Cd8 (4).
**Чорныя:** Kph5, Ch6, пg5 (3).
Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Мікіта Маёраў заваяваў «серабро» на турніры ў французскім Эвіяне (382 удзельнікі), а на другім турніры ў Францыі (82 удзельнікі) быў сёмым. Уладзіслаў Кавалёў выйграў турнір у латвійскай Ліепаі (130 шахматыстаў), а ў другім спаборніцтве ў тым жа горадзе быў трэцім. Сяргей Азараў фінішаваў другім на адкрытым першынстве ЗША ў Норфалку (396 удзельнікаў). На фестывалі ў Рызе беларусы ў турніры «В» (88 удзельнікаў) занялі 1—3 і 5-е месцы (адпаведна Наталля Папова, Іван Жук, Вольга Малацілава і Рахіль Эйдэльсон); у турніры «С» (49 удзельнікаў) Уладзіслаў Каташук узяў шосты прыз.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.Лb8 Kpe6 2.Лd8, 1...Kpg6 2.Лh8.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

## Пятніца, 1 верасня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10, 10.05, 15.25, 16.25 Серыял «Каханне Надзеі». (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар (6+).
**11.40, 12.10, 20.00 Серыял «Пад абцасам». Заключная серыя (16+).**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Позняе раскаянне». (16+).**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.25 Серыял «Байкі Міцяя». Заключныя серыі (12+).**
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы (16+).
**22.00 Меладрама «Цень страказы». (12+).**
**1.45** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца (12+).
**9.00, 22.10** Тэлебарометр.
**9.05, 18.35 Меладрама «Жамчужына палаца». Заключныя серыі (12+).**
**11.35, 16.05** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам. (16+).
**12.05, 22.15** «Бітва экстрасэнсаў». 14-ы сезон. (16+).
**14.10, 21.00** «Паненка-сялянка». (16+).
**15.20, 0.15** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.35 Камедыя «Добрай раніцы». (12+).**
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40, 12.20** «Беларуская кухня». Бульбяная бабка. Кіслая капуста з рабрынкамі.
**8.05, 12.00, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 20.30, 22.35** «Гэты дзень».
**8.25, 16.05 «Старэйшы сын». Драма. (12+).**
**10.45** «Справа жыцця». Міхась Пазнякоў. Серыя кніг для дзяцей.
**11.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці спевака, народнага артыста Беларусі Валерыя Глушакова.
**11.30** «Выйсце ёсць». Мікалай Чаргінец (12+).
**12.45** «Сіла веры». Да Дня беларускага пісьменства.
**13.15** «Славянскі базар у Віцебску-2012».
**14.50** «Аповесць мінулых гадоў». М/ф (0+).
**15.45** «Справа жыцця». Міхась Пазнякоў. Серыя кніг для дзяцей.
**18.20, 21.05 «Майскія зоркі». Драма. (12+).**
**19.50** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.40** «Час кіно».
**22.50 «Сунічная паляна». Драма. (16+).**

### Беларусь 5

**7.05** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. «Цуг» (Швейцарыя) — «Нёман» (Беларусь).
**8.55** Футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2018. Люксембург — Беларусь.
**10.50** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. 1/4 фіналу.
**12.55, 16.35** Дзюдо. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Жанчыны.
**16.00** Футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2018. Агляд гульнявога дня.
**18.50** Футбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2019. U-21. Беларусь — Грэцыя. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**20.50** Спорт-цэнтр.
**21.00** Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат свету. Фіналы.
**23.05** Бокс. Чэмпіянат свету. Паўфіналы.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!» (12+).
**10.15** «Смак» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.10** «Сам-насам з усімі» (16+).
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**14.15** «Час пакажа» (16+).
**16.20 Меладрама «Павадыр» (12+).**
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** Час.
**21.05** «Голас». Новы сезон (12+).
**22.50** «Вячэрні Ургант» (16+).
**23.35 Камедыя «Кухарка» (6+).**
**0.50** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман» (16+).
**9.25** «Далёкія сваякі» (16+).
**9.35, 17.35** «Званая вячэра» (16+).
**10.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30** «Глядзець усім!» (16+).
**11.50 «Студэнты». Серыял (16+).**
**13.50** «Дзіўная справа» (16+).
**15.30** «Вадзіць па-руску» (16+).
**16.05** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50** «Скардзіцца дазваляецца».
**17.10** «Ведай нашых!» (16+).
**19.20** «Тут пачынаецца Радзіма». Відэафільм, прысвечаны 1000-годдзю Брэста.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання: «Мікола Гусоўскі: народжаны нанова».
**21.00** «Будучыня чалавецтва» (16+).
**23.55** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.40 «Інструктар». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00, 5.00** М/ф (0+).
**7.30** Добрай раніцы, свет! (16+).
**8.35 Маст. фільм «Безбілетная пасажырка» (12+).**
**10.20** «Любімыя акцёры» (12+).
**11.30, 13.15, 0.55 Маст. фільм «Танцор дыска» (12+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.25, 3.20** «Іншы свет» (12+).
**15.00** «Справы сямейныя» (16+).
**16.15** «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**17.10 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.20 Маст. фільм «Жорсткі раманс» (12+).**
**22.05** Канцэрт «Аўтарадыё 20 гадоў. Найлепшае» (12+).
**23.50** «Трымайся, шоубіз!» (16+).
**0.25** «Кашмар вялікага горада» (16+).
**3.20 Маст. фільм «Папялушка.ру» (12+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым (12+).
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.00** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35, 20.40 Серыял «Тайны следства» (12+).**
**15.25** «Пакой смеху» (16+).
**17.35 Серыял «Сваты» (16+).**
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**22.20, 23.20** «Петрасян-шоу» (16+).
**23.10** «Тут пачынаецца Радзіма». Відэафільм, прысвечаны 1000-годдзю г. Брэста.
**0.50 Маст. фільм «Асколкі хрустальнага туфліка» (12+).**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Дзелавая раніца НТБ» (12+).
**7.10, 8.05 Серыял «Таксістка» (16+).**
**8.55 Серыял «Вяртанне Мухтара» (16+).**
**9.45, 23.05** «НЗ.by».
**10.20, 19.40** Дзённік «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**10.25 Серыял «Ляснік» (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных» (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05, 16.35** «Месца сустрэчы» (16+).
**17.30** «Следства вялі...» (16+).
**19.45, 23.25 Серыял «Марскія д'яблы» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.00, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** М/ф.
**8.10 Серыял «Вялікі перапынак» (12+).**
**9.15, 17.00 Серыял «Цёмная тэрыторыя» (18+).**
**10.45** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**11.00 Драма «Фаварыт» (12+).**
**13.15, 19.05 Серыял «Вікторыя».**
**15.00, 18.20 Серыял «Вербніца» (16+).**
**16.00** «Мультпарад».
**16.30** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Меладрама «Красуня» (16+).**
**23.05 Серыял «Станіца» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 14.10** Серыял «Вароніны». (12+).
**8.00** «Ералаш». (6+)
**8.30, 4.20** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.50, 4.40** М/ф «Фіксікі». (0+)
**9.10, 5.00** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+)
**9.30, 19.00** «Уральскія пельмені». (16+).
**10.30** Меладрама «За мной апошні танец». (12+).
**12.40** «Дурні і дарогі» (16+).
**13.10** Серыял «Мамачкі-3». (16+).
**16.20, 1.50** Серыял «Беглыя сваякі». (16+).
**17.20, 3.50** Серыял «Гэта каханне». (16+).
**17.50** Серыял «Кухня-6». (16+).
**21.00** Баявік «Місія невыканальная 2». (12+).
**23.20** Жахі «Праклён-2». (16+).
**1.20** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**2.40** «Лаві момант». (16+).
**3.00** «Не можа быць!» (16+).
**5.10** Серыял «Амазонкі». (16+).

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.10** Навіны культуры.
**10.20** «Каломба». Серыял.
**11.55** «Абсалютны слых».
**12.35** «Медычы. Хросныя бацькі Рэнесансу». Дак. серыял.
**13.30** VIII міжнародны фестываль Мсціслава Растраповіча. Акадэмічны сімфанічны аркестр Санкт-Пецярбургскай філармоніі імя Д. Д. Шастаковіча.
**15.10** «Настаўнік». Маст. фільм.
**16.50** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**17.20, 0.25** «Ад'ютант яго правасхадзіцельства». Маст. фільм.
**18.35** «Справа №. Сялянскія «Рычагі» Аляксандра Яшына».
**19.00** Смехаанастальгія.
**19.45** Канцэрт нумар адзін. Дзяніс Мацуеў, «Синяя птица» і сябры ў Крамлёўскім палацы.
**22.00** «Жыў-быў настройшчык...» Маст. фільм.
**23.25** Джон Ленан. «Imagine». Фільм-канцэрт.
**1.40** «На Поўдзень ад Поўначы». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Дзе знаходзіцца радзіма залатога руна?»
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Тацянай Візбар. 2008 год (12+).
**6.55, 8.25, 9.40, 11.00, 12.55, 14.25, 15.40, 17.00, 18.55, 20.30, 21.40, 1.25, 2.45, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.20, 13.20, 1.45** Маст. фільм «Гонкі па вертыкалі» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «The Beatles». 2005 год (16+).
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1984. 1-я частка. 2011 год (16+).
**19.20** Фільм-спектакль «Алі-Баба і 40 разбойнікаў». 1983 год (16+).
**20.45** «Прэс-экспрэс» ад 1 верасня 1993 года (16+).
**22.00** «Колба часу» (16+).
**23.00** Тэлеспектакль «Джэнтльмены, якім не пашанцавала». 1977 год (16+).
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Магія і перабудова». 2007 год (12+).
**1.00** Дак. фільм «Эцюд пра казанне» (12+).

### EuroSport 1

**4.00, 8.00, 11.00, 13.50, 19.00, 22.15, 2.15** Тэніс. US Open.
**9.30, 12.30, 15.00, 16.00** Веласпорт. «Вуэльта».
**13.15** Універсіяда.
**15.45, 18.45** Веласпорт. «Вуэльта»-экстра.
**22.00, 2.00** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс».

### Кінакамедыя

**0.20** «Татулі». Камедыя (16+).
**2.00** «Няголены нянь». Камедыя (16+).
**3.40** «Прышэлец з космасу». Фантастыка (16+).
**5.25** «Каханне з рызыкай для жыцця». Меладрама (16+).
**7.00** «Клік: з пультам па жыцці». Драма (12+).
**9.00** «Вампіркі». Камедыя (16+).
**10.40** «Мноства». Камедыя (16+).
**12.40** «Джэк і Джыл: каханне на чамаданах». Меладрама (12+).
**14.15** «Мой самы страшны кашмар». Меладрама (16+).
**16.00** «Камедыянты (Шоу)» (16+).
**16.35** «Як стаць зоркай». Мюзікл (16+).
**19.30** «Нягоднік». Камедыя (16+).
**21.20** «Гульня ў чатыры рукі». Камедыя (16+).
**23.20** «Эйр Амерыка». Камедыя (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.30** «Шафа» (16+).
**8.15** «Доктар І...» (16+).
**8.45** «Падарунак лёсу». Серыял (16+).
**10.30, 3.45** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.10** «Сляпая» (12+).
**13.10** «Варажбітка» (12+).
**14.15** «Паралельны свет» (12+).
**15.15** «Трэндзі» (16+).
**15.45** «Здзелка» (16+).
**16.15. 2.35** «Рыжыя» (16+).
**17.15, 5.15** «Людзі пятніцы» (16+).
**18.15, 1.45** «Бітва салонаў» (16+).
**19.15, 0.55** «Жанна, пажані» (16+).
**20.15** «Кіраванне гневам». Камедыя (12+).
**22.10** «Савецкія мафіі» (16+).
**23.00** «Улада страху». Трылер (16+).

### ТБ1000

**8.10** Шукальнік вады (16+).
**10.25** Трусіная нара (16+).
**12.20** Пітэр Пэн (12+).
**14.30** Салодкі ліستапад (12+).
**16.50** Банды Нью-Ёрка (16+).
**20.10** Міс Пецігру (16+).
**22.00** Баец (16+).
**0.15** Чужая краіна (18+).
**2.20** Маска (12+).
**4.00** Тры метры над узроўнем неба (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Анёл (12+).
**8.20** Брат 2 (18+).
**10.45** Мора (16+).
**12.25** Нядзельны тата (6+).
**14.20** Атамны Іван (16+).
**16.20, 4.20** Каменнае сэрца. Серыі 1—2-я (12+).
**18.20** Наша Russia. Яйкі Лёсу (16+).
**20.20** Ёлкі 5 (12+).
**22.20** Канец цудоўнай эпохі (16+).
**0.20** Практыкаванні ў цудоўным (16+).
**2.20** Эластыка (16+).

### National Geographic

**6.00** Гульні розуму. (12+).
**6.45** Зрабі або памры. (12+).
**7.10, 9.30, 14.10** Мегазаводы. (12+).
**8.00, 10.20** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**8.45, 16.25, 20.40, 1.35, 5.10** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**11.05, 21.25** Аўта-SOS. (12+).
**11.50, 19.50** Пастка для дыназаўраў. (12+).
**12.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**13.25** Чалавек супраць YouTube. (12+).
**14.55** Супербудаванні Трэцяга рэйха. (12+).
**18.00, 22.15, 2.25** Дзіяна: згубленыя кадры. (12+).
**0.05, 4.20** 80-я. Найвялікшыя футбольныя моманты (12+).
**0.50** Сваіх не кідаем. (16+).

### Discovery

**8.00, 14.00** Выжыць любой цаной. (12+).
**9.00, 15.30, 21.30, 6.45** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00, 6.20** Як гэта зроблена? (12+).
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на рэліквіі. (16+).
**10.30, 16.30, 23.30, 4.15** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00** Аляска: сям'я з лесу. (16+).
**17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**18.00, 1.00** Кола: гульня на выжыванне. (16+).
**19.00, 2.00** Бітвы робатаў. (12+).
**20.00** Вулічная навука. (16+).
**0.00, 7.10** Востраў. (16+).
**2.55** Загадкі планеты Зямля. (16+).
**5.30** Маланкавыя катастрофы. (16+).

## Субота, 2 верасня

### Беларусь 1

**6.10** Існасць.
**6.40 Камедыя «Прыходзьце заўтра...» (12+).**
**8.20** Кулінарная дыпламатыя (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Здароўе (12+).
**10.00** Дача (12+).
**10.35** Вялікі сэлфі-тур (12+).
**11.10** 50 рэцэптаў першага (12+).
**12.10 Серыял «Байкі Міцяя». Заключныя серыі (12+).**
**13.15, 15.45 Меладрама «Тры дарогі». (12+).**
**15.15** Краіна.
**17.35 Меладрама «Гаспадыня вялікага горада». (12+).**
**21.00** Панарама.
**21.40** Тэлефільм АТН.
**22.05 Меладрама «Калі заквітнее багун». (16+).**
**1.35** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05** М/с «Сябры анёлаў». (6+).
**8.05 Фільм для дзяцей «Столік-сам-накрыйся». (6+).**
**9.05, 22.05** Тэлебарометр.
**9.10 Серыял «Шчаслівыя разам-5». (16+).**
**10.15, 20.25** «Тата папаў». (16+).
**11.50** «Свет навыварат». Трэвел-шоу. (16+).
**12.45** Анімацыйны фільм «Монстры на канікулах-2». (12+).
**14.10** Капейка ў капейку (12+).
**14.45** «Вяселле ўсляпую». (16+).
**16.00 Фільм-фэнтэзі «Спайдэрвік: хронікі». (12+).**
**17.35** Рэпарцёр (16+).
**18.20 Маст. фільм «Прагулка». (12+).**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.10** «Вярніце мне прыгажосць». Медыцынскае рэаліці (16+).
**23.30 Фантастыка «Тор-2: царства цемры». (12+).**

### Беларусь 3

**7.35, 12.20** «Сіла веры». Да Дня беларускага пісьменства.
**8.00, 13.15, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.15, 13.30, 20.30** «Гэты дзень».
**8.20** «Неадкрытыя астравы». Прыгоды. (12+).
**9.25** «Я хачу гэта ўбачыць!» Полацк (6+).
**9.55** «Навукаманія». 500-годдзе беларускага кнігадрукавання (6+).
**10.20** «Запіскі на палях». Іван Мележ.
**10.45 «Людзі на балоце». Кінаэпапея. (12+).**
**13.35** «Запіскі на палях». Уладзімір Караткевіч.
**14.05 «Дзікае паляванне караля Стаха». Маст. фільм. (12+).**
**16.15** «Запіскі на палях». Якуб Колас.
**16.40 «Талаш». Драма, 1— 4-я серыі. (16+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05** «Ліра». Народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін.
**21.30 «Глыбокая плынь». Драма. (12+).**
**23.05 «Я, Францыск Скарына». Маст. фільм. (12+).**

### Беларусь 5

**7.55** Футбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2019. U-21. Беларусь — Грэцыя.
**9.40** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
**10.10** Вялікі спорт. Ток-шоу.
**10.55, 0.25** Дзюдо. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Жанчыны.
**14.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**14.50** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — БЧ (Гомель). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**16.45** Хакей. КХЛ. «Спартак» (Масква) — «Дынама-Мінск». У перапынках — (Спорт-цэнтр.)
**19.05** Бокс. Чэмпіянат свету. Фіналы.
**20.25** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. «Вена Кэпіталз» (Аўстрыя) — «Нёман» (Беларусь). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**22.40** Спорт-цэнтр.
**22.50** Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат свету. Фіналы.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**7.05 «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Серыял (16+).**
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды» (0+).
**9.20** «Героі «Вялікага перапынку»(12+).
**10.30** «Смак» (12+).
**11.10** «Ідэальны рамонт» (12+).
**12.10, 16.20 Камедыя «Вялікі перапынак» (6+).**
**16.15, 21.00** (з субцітрамі) Навіны спорту.
**17.05** «Тэорыя змовы» (16+).
**17.55** «Хто хоча стаць мільянерам?» (12+).
**19.25, 21.10** «Сёння вечарам» (16+).
**21.05** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**22.40** «КВЗ». Прэм'ер-ліга (16+).
**0.10 Камедыя «Сардэчна запрашаем, або Пабочным асобам уваход забаронены» (6+).**

### СТБ

**6.20 «Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).**
**7.10** «Тайны Чапман» (16+).
**8.05** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**8.55** «Рамонт па-сумленнаму» (16+).
**9.40** «Самая карысная праграма» (16+).
**10.30** «Тэледоктар» (12+).
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Будучыня чалавецтва» (16+).
**13.10** «Вадзіць па-руску» (16+).
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.45 Маст. фільм «Дзяржаўная граніца. Несапраўдная цэль» (12+).**
**15.50** «Вялікі горад».
**16.40** «Бітва цывілізацый». (16+).
**17.20** Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання: «Псалтыр: літаратурны дэтэктыў», «Тарас на Парнасе: літаратурны дэтэктыў», «Мікалай Гусоўскі: народжаны нанова».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Засакрэчаныя спісы. Тайнае брацтва: хто хоча кіраваць светам?» (16+).
**21.50 «Жорсткі бізнес». Серыял (16+).**
**0.55** «Танкавы бой» (16+).

### МІР

**6.00, 8.20, 3.25** М/ф (0+).
**7.50** «Саюзнікі» (12+).
**9.00** «Вой, мамачкі!» (12+).
**9.30** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Здабытак рэспублік» (12+).
**10.45 Маст. фільм «Жорсткі раманс» (12+).**
**13.30, 2.00 Маст. фільм «Формула кахання» (0+).**
**15.30** «Любімыя акцёры». Аляксандр Абдулаў (12+).
**16.15, 19.15 Серыял «Я прыйду сама» (16+).**
**22.05 Серыял «Сіндром Фенікса». 1—4 серыі (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху» (16+).
**7.40 Серыял «Неадкладная дапамога» (12+).**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.20** «Жывыя гісторыі» (12+).
**12.10** «Пяцёра на аднага» (12+).
**13.00** «Наша справа» (16+).
**13.15** «Пакой смеху» (16+).
**14.15** «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт (16+).
**16.30 Маст. фільм «Снег растане ў верасні» (12+).**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.55** «Суботні вечар» (12+).
**22.20 Маст. фільм «Правінцыяльная мадонна» (16+).**

### НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10** «Ты супер!» (6+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Урачэбныя тайны плюс» (12+).
**8.55** «Паедзем, паядзім!» (0+).
**9.40** «НЗ.by».
**10.20** Галоўная дарога (16+).
**11.00** «Ежа жывая і мёртвая» (12+).
**12.00** Кватэрнае пытанне (0+).
**13.10** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.15 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+).
**17.10** «Сакрэт на мільён». Валерыя (16+).
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.00** «Ты супер! Танцы» (6+).
**22.10** Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**22.15 Серыял «Марскія д'яблы» (16+).**
**23.55** «Аднойчы...» (16+).

### 8 канал

**9.00, 15.55, 19.10, 21.10, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** «Сябры дзядулі Марка».
**9.30** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**9.40 «Сінематограф».**
**11.20 Меладрама «Прыгажуня».**
**13.20 Камедыя «Прызнанне жанчыны, якой выракліся» (12+).**
**14.45** Глядзім ўсёй сям'ёй. М/ф.
**16.00** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**16.30 Серыял «Эксперт» (16+).**
**17.25 Трылер «Адваротны адлік» (16+).**
**19.15 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе» (16+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**21.15 Трылер «Дзяўчына з татуіроўкай дракона» (18+).**

### ВТБ

**6.00, 1.10** «Турбаміксер». (16+).
**7.00** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**8.00** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+).
**9.00, 3.00** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**9.20, 3.20** М/ф «Фіксікі». (0+)
**9.40, 3.35** М/ф «Марын і яго сябры». (0+)
**10.00** М/ф «Аліса ведае, што рабіць!» (6+)
**10.30** М/ф «Ліга Watchcar».
**11.00, 2.40** «Ералаш». (6+)
**11.20** Анімацыйны фільм «Уцёкі з планеты Зямля». (0+).
**13.00** Серыял «Пушкін». (16+).
**15.00** Камедыя «Два дні». (12+).
**16.50** Баявік «Аграбленне паітальянску». (16+).
**19.00** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.00** Баявік «Місія невыканальная-3». (12+).
**23.30** Жахі «Логава звера». (16+).
**4.00** «Лаві момант». (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі». (16+).

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «Жыў-быў настройшчык...» Маст. фільм.
**11.45** «Больш, чым каханне». Ралан Быкаў і Алена Санаева.
**12.25** «Там, дзе рыбы ўмеюць хадзіць». Дак. фільм.
**13.20** Міжнародны фестываль цыркавога мастацтва ў Монтэ-Карла.
**14.30** Ілюзіён. «Чырвоны шар». «Белагрывы». Маст. фільмы.
**15.45, 1.55** Па слядах тайны. «Ці была ядзерная вайна да нашай эры? Індыйскі след».
**16.30** «Хто там...»
**17.00** «Лінія жыцця». Валянцін Смірніцкі.
**17.55** «Тайна двух акіянаў». Маст. фільм.
**20.20** Вялікая опера-2016 у Вялікім тэатры Расіі.
**23.00** Кіно на ўсе часы. «Доўгі дзень сыходзіць у ноч». Маст. фільм.
**1.45** «Мартынка». М/ф для дарослых.
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

